

КУРЫЦА — МЯСА ДЛЯ ЎСЯГО СВЕТУ 11

ШТО ПАКАЖУЦЬ 18 МАЯ Ў МІЖНАРОДНЫ ДЗЕНЬ МУЗЕЯЎ 12



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

18 МАЯ 2021 г. АЎТОРАК № 91 (29460)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр ШУМІЛІН, старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях:**

*«Беларуская навука займае дастойнае месца ў сусветнай навуковай прасторы, а па некаторых напрамках — ІКТ, нанатэхналогіі і нанаматэрыялы, медыцынскае абсталяванне, генетыка і біятэхналогіі — фарміруе новыя трэнды развіцця. Мы робім стаўку на пабудову эканомікі ведаў і інавацыйны шлях развіцця, аднак без уцягвання маладых людзей у навуковую і інавацыйную дзейнасць, падрыхтоўкі адпаведных кадраў зрабіць гэта немагчыма. У краіне створаны эфектыўныя механізмы падтрымкі, у тым ліку фінансавыя стымулы для прыцягнення таленавітай моладзі ў навуку і інавацыйнае прадпрымальніцтва».*

# Калі Вішні цвітуць



Вёска Вішні — самы далёкі населены пункт Касцюковіцкага раёна (само сабой — і ад сталіцы) — сапраўдная глыбінка: усяго толькі пару кіламетраў ад беларуска-расійскай граніцы. З вялікай — на дзвесце дваццаць жыхароў — паціху-памалу яна стала маленькай, і цяпер у Вішнях пражывае толькі дзевяць чалавек. Сярод іх і сямідзесяцігадовая Аляксандра БАЦУНОВА, надзвычай пазітыўны чалавек, працавітая жанчына. Не з'язджае ў горад да дзяцей і ўнукаў, бо любіць сваю маленькую радзіму. Тут яна нарадзілася, выйшла замуж, пахавала мужа. Калісьці, больш за трыццаць гадоў таму, працавала даяркай у калгасе «Праўда». А цяпер таксама не лянуецца і шчыруе на агародзе — саджае бульбу, агуркі і памідоры. А колькі ў Аляксандры Фёдараўны кветак — і пад вокнамі, і ў палісадніку, і на вуліцы каля брамкі! Адпаведна назве населенага пункта, на падворку пенсіянеркі цвітуць і вішні (цяпер іх час). А яшчэ — грушы, яблыні і чаромха. У той дзень, калі я наведаў вёску Вішні, на сотках Аляксандры поўным ходам ішла пасадка другога хлеба, але прыветная жанчына знайшла хвілінку, каб пагаварыць з журналістам «Звязды» і папазіраваць перад фотакамерай.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- Аляксандр Лукашэнка падпісаў закон па пытаннях забеспячэння нацыянальнай бяспекі і закон аб дзяржаўнай абароне.
- **Адбылася тэлефонная размова Аляксандра Лукашэнкі з Ніколам Пашынянам. Лідары абмеркавалі становішча, якое складваецца ўнутры абедзвюх краін — Беларусі і Арменіі, абмяняліся думкамі аб актуальным парадку дня, выкліках і пагрозах, якія існуюць.**
- ВУП Беларусі ў студзені—красавіку вырас на 2,5 %.
- **КДК правядзе гарачыя лініі аб даступнасці рынкаў для вытворцаў сельгаспрадукцыі.**

ISSN 1990 — 763X

Каб памяталі

# У ТЫЛЕ ВОРАГА

## Да гадавіны выхаду першага падпольнага нумара «Звязды»

**Гэта быў беспрэцэдэнтны выпадак у гісторыі беларускага друку! У акупаваным Мінску, пад самым носам у ворага, журналісты-падпольшчыкі сабралі неабходны для выхаду газеты рэквізіт і выпусцілі паўнавартасны нумар. Тыраж (2,5 тысячы экзэмпляраў!) разляцеўся імгненна: падпольную «Звязду» перадавалі з рук у рукі, зачытвалі да дзірак, захоўвалі як самую дарагую рэліквію. Выход газеты сведчыў: ідзе сур'ёзная падпольная барацьба з ворагам, у якую ад малога да вялікага ўключыўся беларускі народ.**

СТАР. 4



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Надзея АМЕЛЬЯНЮК разам з мужам каля помніка журналістам-падпольшчыкам. Тут, каля Чырвонага касцёла, загінуў яе легендарны дзядзька.**

Напярэдадні

# З абмежаваннямі, але для ўсіх ахвотных

## Як пройдзе дзіцячая летняя аздараўленчая кампанія

**Дзіцячыя лагеры сёлета мусяць адкрыцца з пачатку чэрвеня, але абмежаванні, звязаныя з COVID-інфекцыяй, па-ранейшаму будуць уплываць на іх работу. Тут не будзе традыцыйных бацькоўскіх дзён, а трапіць на тэрыторыю дзіцячых аздараўленчых устаноў пабочным асобам будзе немагчыма. Некаторыя абмежаванні захаваюцца і для саміх работнікаў дзіцячых устаноў. Якой будзе дзіцячая летняя аздараўленчая кампанія — 2021, расказалі спецыялісты.**

### КОШТ ПУЦЁВАК І ДАПАМОГА ДЗЯРЖАВЫ

Плануецца, што на летняе аздараўленне дзяцей будзе выдаткавана, у тым ліку і з рэспубліканскага бюджэту, 45 мільёнаў рублёў. З іх 600 тысяч рублёў накіравана на падрыхтоўку стацыянарных лагераў да летняга сезона, расказаў **намеснік дырэктара — начальнік аддзела Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні Аляксандр ЦАЙ.** Усяго ж на гэтыя мэты наймальнікамі і іншымі зацікаўленымі затрачана каля 15 мільёнаў рублёў.

Плануецца, што аздараўленне сёлета пройдуць 342 тысячы дзяцей, у тым ліку ў лагерах з дзённым знаходжаннем — 198 тысяч, з кругласутачным — 144 тысячы. Працаваць гэтым летам будзе 5,5 тысячы лагераў. Работы па іх падрыхтоўцы да прыёму дзяцей, рамонце і закупцы абсталявання завяршаюцца, вядзецца адбор персаналу.

СТАР. 3

# У СЯБРОЎСКАЙ АТМАСФЕРЫ

**Адбылася сустрэча старшыні Савета Рэспублікі Наталлі КАЧАНАВАЙ з актывам грамадскага аб'яднання «Беларуская асацыяцыя шматдзетных бацькоў». Нагода для спаткання — святкаванне ў краіне Міжнароднага дня сям'і.**

Размова адразу скіравала на тэмы, якія хвалявалі суразмоўцаў, і прайшла ў атмасферы таварыскасці, даверу і добразычлівасці. Спачатку старшыня Савета Рэспублікі



Фота БелТА.

лаканічна і даходліва расказала аб дзейнасці сенатараў у верхняй палаце парламента над законапраектамі. Яна асабліва падрабязна спынілася на той вялікай увазе і клопатах, якія пастаянна праяўляе беларуская дзяржава па ўмацаванні ролі інстытута сям'і ў Беларусі ўвогуле і па падтрымцы шматдзетных бацькоў у прыватнасці. Наталля Качанава адзначыла, што як маці дваіх дзяцей яна на ўласным вопыце зазнала ўсе складанасці і няпростыя моманты ў выхаванні падрастаючага пакалення.

На яе думку, дзякуючы сям'і мацнее і развіваецца дзяржава, расце дабрабыт народа. Таму ў нашай краіне вельмі важна захоўваць традыцыйныя каштоўнасці, у тым ліку і традыцыйную сям'ю. Бо гэта ненармальна, што шмат дзяцей (27 працэнтаў) растуць і выхоўваюцца ў няпоўных сем'ях. Вельмі важна, каб сям'я была трывалая і поўная, а ў кожнага дзіцяці былі маці і бацька, падкрэсліла Наталля Качанава.

Размова таксама зайшла і аб іншых складаных пытаннях сямейнага жыцця, аб той жа велізарнай колькасці разводаў, з-за чаго і ўзнікаюць няпоўныя сем'і. З жалем старшыня Савета Рэспублікі адзначыла і тое, што сёння маладыя людзі ўступаюць у шлюб у досыць познім узросце, бо спачатку хочуць атрымаць добрую адукацыю, зарабіць грошы і г. д. А таму і дзяцей заводзяць таксама дастаткова позна: многія жанчыны нараджаюць першае дзіця ў 28—29 гадоў. Не лепшая і традыцыя многіх сучасных сем'яў мець толькі адно дзіця, бо маці трэба рабіць кар'еру, пажыць для сабе, інакш будзеш звязаная выхаваннем немаўляці.

Адсюль і значная роля «Беларускай асацыяцыі шматдзетных бацькоў», дзякуючы якой можна і трэба ўплываць на моладзь, паказваць прыклад і вучыць іх жыць на карысць сабе і грамадству, падкрэсліла старшыня Савета Рэспублікі.

**Мікалай ЛЮБЧАНСКІ.**

Блізкая ўлада

# УСЁ ДЛЯ ЛЮДЗЕЙ

**Аплата праезду ў грамадскім транспарце, пытанні арэнды кватэр і азелянення двароў былі закрануты падчас прамой тэлефоннай лініі старшыні Мінгарвыканкама Уладзіміра КУХАРАВА, паведаміла БелТА.**

Паводле яго слоў, у камітэце эканомікі Мінгарвыканкама будзе створаны аддзел транспарту, які зоймецца эканамічным аналізам, пытаннямі, звязанымі з праязнымі, перыядычнасцю руху транспарту, будзе ўносіць прапановы па ўкараненні новых тэхналогій. «Мы павінны стварыць усе ўмовы, каб чалавек меў магчымасць аплачваць праезд у грамадскім транспарце любым зручным для яго відам плацежнай сістэмы. Гэта таксама дасць магчымасць знізіць выдаткі на ўтрыманне вялікай колькасці білетных кіёскаў, на што ідуць немалыя сродкі», — заявіў Уладзімір Кухараў.

Сваё пытанне падчас прамой лініі задаў мужчына, які пражывае па вуліцы Багдановіча. Ён паскардзіўся на матацыклістаў, якія ездзяць па вуліцы на вялікай хуткасці, шумяць, замінаючы гараджанам у вячэрні час. Уладзімір Кухараў адзначыў, што такая язда часта прыводзіць да сумных наступстваў. «Па гэтых удзельніках руху пастаянна вядзецца работа, а на выхадных узмацняецца патруляванне супрацоўнікамі ДАІ. Многія парушальнікі прыцягваюцца да адказнасці», — сказаў старшыня Мінгарвыканкама.

Акрамя таго, мінчанін закрануў пытанне, звязанае з азеляненнем. Пры забудове жылога комплексу «Прэстыжына» недалёка ад яго дома выкарчавалі дрэвы, аднак на пустцы, якая ўтварылася такім чынам, узамен нічога не пасадзілі. «Давайце восенню разам з жыхарамі правядзём у вас суботнік. Мы прывязём дрэвы і дапаможам іх высадзіць», — прапанаваў старшыня Мінгарвыканкама.

65-гадовая жанчына з дома на праспекце Пушкіна падзялілася праблемай, з якой не можа справіцца ўжо на працягу года. Так, сусед з чатырохпакаёвай кватэры, якая знаходзіцца вышэй, здае яе ў арэнду вялікай колькасці людзей. Жыхарка неаднаразова звярталася па дапамогу ў розныя інстанцыі. «У кватэры могуць пражываць адначасова да васьмі чалавек. У мяне чуваць кожны крок, часта не магу заснуць да раніцы. Першых кватарантаў ужо дапамаглі выселіць, аднак сітуацыя паўтараецца: гаспадар зноў упускае шумных арандатараў. Міліцыя рэгулярна прыязджае, рэгіструе шумы: толькі з сакавіка было дзевяць такіх выклікаў. Я не ведаю, як жыць далей: на маіх руках старэнькі чалавек пад 90 гадоў», — расказала жанчына.

Па словах Уладзіміра Кухарава, такія сітуацыі часта ўзнікаюць у гараджан: «Пытанне зразумелае. Мы разбяромся, што там адбываецца. Гэтыя людзі павінны выконваць правілы. Будуць прыняты меры».

Супрацоўніцтва

# У ПРАВАВЫХ ПЫТАННЯХ НЯМА ДРОБЯЗЯЎ

**Член Прэзідыума, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей СІВЕЦ узяў удзел у рабоце Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі краін — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў па прававых пытаннях. Пасяджэнне прайшло ў рэжыме відэаканферэнцыі.**

Нагадаем, Міжпарламенцкая Асамблея — галоўная пляцоўка для ўзаемадзеяння прадстаўнікоў дзяржаў Садружнасці, у тым ліку і для абмеркавання злабадзённых прававых пытанняў. Вось і цяпер яны былі ў цэнтры ўвагі парламентарыяў.

Парадак дня пасяджэння быў даволі насычаны — удалося разгледзець 14 пытанняў, у тым ліку работу над праектамі мадэльных законаў «Аб ацэначнай дзейнасці», «Аб страхаванні», «Аб фондах». Таксама адбыўся карысны абмен думкамі аб канцэпцыі і структуры праектаў мадэльных законаў «Аб фінансавых здзелках», «Аб спосабах забеспячэння выканання абавязацельстваў», «Аб абароне правоў спажыўцоў» (новая рэдакцыя) і іншых праектаў мадэльных законаў. Члены Пастаяннай камісіі МПА СНД разгледзелі і праект мадэльнага закона «Аб дагаворным праве (агульныя палажэнні)». Пасля абмеркавання дадзены дакумент плануецца накіраваць у парламенты дзяржаў — удзельніц МПА СНД для атрымання экспертных заключэнняў.

На думку сенатара, гэта тое, што ляжыць у плоскасці грамадзянска-прававых адносін і будзе вельмі карысным і каштоўным для распрацовак, якія цяпер вядуцца ў рамках карэкціроўкі Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь. А вынікі пасяджэння Пастаяннай камісіі будуць пакладзены ў аснову далейшага развіцця інтэграцыйнага працэсу і стануць добрай дапамогай ва ўдасканаленні айчыннага заканадаўства, падкрэсліў Сяргей Сівец.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

Акцэнты

# «ЗМЕНЫ Ў ЗАКАНАДАЎСТВЕ ПРАДЫКТАВАНЫ РЭАЛІЯМІ ЧАСУ»

**Днямі кіраўнік дзяржавы падпісаў законы аб недапушчэнні рэабілітацыі нацызму і змяненні законаў па пытаннях процідзеяння экстрэмізму. Сваімі думкамі аб новым дакуменце падзялілася член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па адукацыі, культуры і навуцы Таццяна АЎТУХОВА. У парламенце яна прадстаўляе Віцебскую-Чкалаўскую акругу № 18.**



***— Таццяна Анатолеўна, навошта спатрэбілася мяняць заканадаўства?***

— У тым, што адбывалася ў Беларусі са жніўня мінулага года, хоць апаненты ўлады і называлі гэта мірнымі пратэстамі, можна было заўважыць экстрэмісцкія праявы. Усё ішло па нарастаючай. Спачатку ўпэўнілі частку насельніцтва, большасць якога была моладзь, у іншых каштоўнасцях. Потым адбыліся сутыкненні людзей з рознымі палітычнымі поглядамі. Былі і спробы экстрэмісцкіх праяў: падпалы аўтамабіляў, выкарыстанне кактэйляў Молатава. На шчасце, вельмі прафесійна і аператыўна спрацавалі спецыяльныя службы і папярэдзілі рэалізацыю больш маштабных экстрэмісцкіх задум.

Што датычыцца неабходнасці змены адпаведнага заканадаўства, закон у мінулай рэдакцыі ўжо не працаваў. І беларускае заканадаўства ў параўнанні з аналагічным у іншых краінах было вельмі ліберальнае. Таму ўзнікла неабходнасць, скажам так, у пазапланавым парадку прапрацаваць гэтыя законы.

Ну, што змянілася, калі коратка — пра самае важнае. Упершыню вызначаны тэрміны: «экстрэмісцкая сімволіка і атрыбутыка», «экстрэмісцкія фарміраванні», пашырана фармулёўка самога тэрміна «экстрэмізм». Устаноўлены паскораны разгляд спраў у грамадзянскім працэсе ў дачыненні да арганізацый з прызнаннем экстрэмізму, а таксама з выкарыстаннем сімволікі і атрыбутыкі, парадак забароны дзейнасці экстрэмісцкіх фарміраванняў.

Упершыню прадугледжваецца адказнасць за ўдзел у такіх фарміраваннях, за раскрыццё загадзя лжывых звестак аб палітычным, эканамічным, сацыяльным, ваенным, міжнародным становішчы Беларусі, прававым становішчы грамадзян, дзейнасці дзяржаўных органаў улады.

Усё накіравана на ўзмацненне нацыянальнай і грамадскай бяспекі.

***— Ці закраналася гэта тэма на сустрэчах з выбаршчыкамі?***

— Многія мае выбаршчыкі шчыра цікавяцца тым, што робіцца, каб гісторыя была аб'ектыўнай, а не на патрэбу часу — у інтарэсах нейкіх асоб, груп людзей. Здарова, што ў большасці гэта людзі, адданыя Радзіме, усім сэрцам любяць яе. Таму падчас стасункаў у акрузе адчувала шчырую занепакоенасць той грамадска-палітычнай сітуацыяй, якая склалася ў Беларусі. І шмат разоў чула словы пра жаданне захаваць краіну і працягнуць яе паступальнае развіццё.

Людзі таксама выказваюць падтрымку інтэграцыі з Расіяй. Наша суседка — вялікая і магутная дзяржава, і мець такога саюзніка і сябра вельмі добра. Няпростая паслявыбарная сітуацыя ў Беларусі толькі зблізіла дзве краіны. Гледзячы на наш вопыт, улада Расіі спрацавала на апярэджанне і зрабіла больш жорсткімі свае законы. Гэта дазволіла пратэсныя акцыі, якія пачаліся ў Расіі, пагасіць у самыя кароткія тэрміны.

Гістарычная памяць пра Вялікую Айчынную вайну палітая крывёй кожнага трэцяга беларуса, і мы не павінны дазволіць гераізаваць нацызм і выкарыстоўваць нацысцкую сімволіку.

***— На жаль, і раней і Віцебск, і Мінск чулі выбухі, якія прыводзілі да раненняў і чалавечых ахвяр у мірны час.***

— Не магу сабе ўявіць, што рухае і кіруе людзьмі, якія здольны на тэрарыстычныя дзеянні. Калі такое здараецца, жудасна разумець, што яны жылі сярод нас, вучыліся, працавалі і прыдумвалі жудасныя планы, якія потым, на жаль, рэалізавалі. Хочацца верыць, што падобнае больш не паўтарыцца.

***— Вы педагог, узначальвалі педагагічны калектыў віцебскай сярэдняй школы № 45. Прэзідэнт гаварыў, што неабходна ўзмацніць кірунак дзейнасці ў патрыятычным выхаванні, што пры гэтым трэба з моладдзю размаўляць на даступнай мове. Нешта ўжо можна канстатаваць наконт таго, што зроблена?***

— Патрыятызм — такое пачуццё, якое робіць кожнага чалавека і народ у цэлым адказнымі за лёс сваёй краіны.

Канешне, неабходны пошук новых формаў уплыву на падрастаючае пакаленне, фарміравання ў хлопчыкаў і дзяўчынак грамадзянскай адказнасці, нацыянальнай самасвядомасці.

Пачуццё патрыятызму нельга навязаць — яго трэба ўзгадоўваць з першых гадоў жыцця, і не толькі ва ўстановах адукацыі, але і ў сям'і. Таму ў краіне распачалі работу над праграмай патрыятычнага выхавання насельніцтва.

Гаворачы пра формы, канешне, трэба перанесці выхаваўчую работу ў інтэрнэт, таму што рэсурсы віртуальнага свету для моладзі — асноўная крыніца інфармавання. Яна даведваецца пра тое, што адбываецца, праз сацыяльныя сеткі, новыя медыя. І ўжо распачата работа ў гэтым кірунку. Грамадскія арганізацыі, парламент краіны, мясцовая ўлада сваю дзейнасць адлюстроўваюць у Instagram, Telegram-каналах — для таго каб у інтэрнэт-прасторы моладзь магла адсочваць тое пазітыўнае, што робіцца ўладай у іх населеных пунктах, краіне.

І патрыятычнае выхаванне трэба праводзіць не толькі сярод моладзі, але і сярод усіх, незалежна ад узросту. У гэтым кірунку ўжо ёсць напрацоўкі.

***— Хутка лета. Ці ёсць, на вашу думку, небяспека аднаўлення спроб рэвалюцый у Мінску?***

— Хацелася б, каб не толькі ў сталіцы, але і ў кожным куточку нашай цудоўнай краіны панавалі мір, адзінства, спакой, а ўсе дзеянні грамадзян былі накіраваны на стваральную дзейнасць у імя светлай і прыгожай будучыні. Спадзяюся, так і будзе.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# З абмежаваннямі, але для ўсіх ахвотных

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Сярэдні кошт пуцёўкі ў гэтым сезоне ў лагер з кругласутачным знаходжаннем на 18 дзён складзе 520 рублёў. Дзяржаўная датацыя пры гэтым — 215 рублёў. Плюс дапамога наймальніка па месцы працы бацькоў, прафсаюзныя сродкі ці даплата па калектыўнай дамове. Бацькі за пуцёўку такім чынам аплацяць усяго каля 10 %. У дзённы лагер на такі ж тэрмін пуцёўка будзе каштаваць 127 рублёў, памер дзяржаўнай датацыі — 89.

Працаваць лагеры пачнуць у першай дэкадзе чэрвеня. Летась, дарэчы, яны адкрыліся ў сярэдзіне чэрвеня, калі пайшла на спад захваральнасць на каранавірусную інфекцыю.



— Сёлета заўважна актыўнасць бацькоў і іх зацікаўленасць. Летась попыт быў ніжэйшы, — адзначыў Аляксандр Цай.

## АДСУТНАСЦЬ БАЦЬКОЎСКІХ ДЗЁН І ІНШЫЯ АБМЕЖАВАННІ

— Цяпер ідзе трэцяя хваля каранавіруснай інфекцыі, але яна вельмі спецыфічная. Калі падчас першай рэгістравалася менш захварэлых, падчас другой восенню і зімой — значная іх колькасць, то зараз мы рэгіструем каля васьмі тысяч новых выпадкаў кожны тыдзень. Прагназуецца, што такая сітуацыя будзе да канца чэрвеня, — расказвае **загадчык аддзялення гігіены дзяцей і падлеткаў Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Ала МАЛАХАВА.** — Таму мы пачынаем аздараўленчую кампанію сёлета ў больш сур'ёзнай сітуацыі, чым летась, калі з сярэдзіны чэрвеня назіраўся спад захваральнасці.

Тым не менш спецыяліст адзначыла, што патрабаванні да работы персаналу лагераў будуць больш лаяльнымі: яны павінны мець медыцынскую даведку аб стане здароўя і адсутнасць кантактаў першага ўзроўню. Наймальнікам рэкамендавана аддаваць перавагу тым, хто прайшоў вакцынацыю ад COVID-19. Пры гэтым выключана пяцідзённая самаізаляцыя і бязвыезны рэжым работы.

— Але гэта не азначае, што кіраўнікі дзіцячых аздараўленчых устаноў не могуць прымаць такія меры. Іх можна ўводзіць, калі выяўлены адзін і болей выпадкаў захворвання, — адзначыла Ала Малахава.

Яна падкрэсліла, што ўваходны кантроль будзе строгі. Гэта штодзённая тэрмаметрыя для персаналу і апытанне аб стане здароўя. Тое ж самае будзе прымяняцца і да дзяцей у лагерах з дзённым знаходжаннем.

— Згодна з рэкамендацыямі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, да названых мер дадаюцца сацыяльнае дыстанцыяванне, узмоцнены рэжым прыбірання — тры разы на дзень. Усё гэта дае добры эфект, — упэўнена спецыяліст. — Толькі 10 % захварэлых — гэта дзеці, у тым ліку каля 8 % — школьнікі. Да таго ж дзеці хварэюць, як правіла, у лёгкай форме. Таму, калі захоўваць усе меры, наша аздараўленчая кампанія пройдзе паспяхова.

Застанецца ў гэтым сезоне актуальнай і забарона на бацькоўскія дні. Калі раней мамы і таты маглі наведваць карпусы, для іх ладзіліся канцэрты і іншыя мерапрыемствы, то сёлета такіх масавых сустрэч не будзе.

— Бацькі, канешне, могуць прыехаць, за тэрыторыяй лагера ёсць альтанкі, дзе на свежым паветры можна сустрэцца з дзецьмі, таксама ў іх прымуць перадачу. У карпусах на тэрыторыі лагера гэта забаронена, — удакладніла Ала Малахава.

Абмежаванні датычацца і масавых мерапрыемстваў і экскурсій. Іх рэкамендавана не праводзіць увогуле на працягу першых пяці дзён, каб паназіраць за станам здароўя дзяцей. Унутрылагерныя мерапрыемствы павінны праходзіць з захаваннем усіх мер перасцярогі. Пры масавым завозе дзяцей кіроўца аўтобуса павінен быць у сродках аховы, а поручні ў транспарце мусяць своечасова апрацоўвацца.

## КОЛЬКАСЦЬ ПАТРЫЯТЫЧНЫХ ЛАГЕРАЎ І ЗМЕН ПАВЯЛІЧЫЦЦА

Як паведаміла **кансультант упраўлення сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі Ларыса ЕМЯЛЬЯНЧЫК,** усе ахвотныя аздаравіцца сёлета атрымаюць пуцёўкі. Не застануцца без увагі і дзеці, якія маюць патрэбу ў падтрымцы дзяржавы, — са шматдзетных і апякунскіх сем'яў, дзеці-сіроты. Пуцёўкі атрымаюць каля 12 тысяч дзяцей-сірот і каля 5 тысяч дзяцей-інвалідаў.

Асаблівасцю сёлетняй аздараўленчай кампаніі стане павелічэнне лагераў і профільных змен патрыятычнай накіраванасці, якія будуць узаемадзейнічаць з воінскімі часцямі, органамі ўнутраных спраў і МНС. Будзе павялічана колькасць педагагічных атрадаў з ліку студэнцкай моладзі. У прыватнасці, толькі ў БДПУ імя М.Танка створана 37 такіх атрадаў з паўтысячы студэнтаў. Педагагічныя атрады сфарміраваны ва ўсіх ВНУ і рэгіёнах краіны.

**Алена КРАВЕЦ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Кіруючая ў Чылі кааліцыя атрымала менш за траціну галасоў на выбарах ва Устаноўчы сход



Кааліцыя «Наперад, Чылі!» па выніках выбараў не атрымае дастаткова месцаў ва Устаноўчым сходзе, каб мець магчымасць самастойна заблакіраваць прыняцце новых артыкулаў Канстытуцыі падчас яе распрацоўкі. Пра гэта сведчаць папярэднія вынікі галасавання, якія апублікавала выбарчая служба краіны, паведаміла ТАСС. Паводле гэтых даных, за кандыдатаў «Наперад, Чылі!» прагаласавала 20,88 % выбаршчыкаў. У новую Канстытуцыю краіны ўвойдуць тыя пункты, якія падтрымаюць дзве траціны са 155 членаў Устаноўчага сходу. Такім чынам, прыхільнікі кіруючай правай кааліцыі не змогуць самастойна ні прыняць, ні заблакіраваць прапановы аб новых артыкулах Асноўнага закона. Найбуйнейшыя левыя і левацэнтрысцкія партыі, якія былі прадстаўлены на гэтых выбарах у складзе дзвюх кааліцый, у суме заручыліся падтрымкай 33,22 % выбаршчыкаў. Астатнія галасы дасталіся невялікім партыям і незалежным кандыдатам. Прэзідэнт Чылі Себасцьян Піньера назваў праведзенае галасаванне гістарычным і прызнаў, што яго вынікі паказалі, што грамадзяне незадаволены палітычным істэблішментам краіны.

### Падчас абвальвання трыбуны ў ізраільскай сінагозе пацярпела звыш 200 чалавек

У выніку надзвычайнага здарэння ў сінагозе ў Гіват-Зееў на заходнім беразе ракі Іардан пацярпелі 219 чалавек, паведаміла Ynet. Паводле звестак медыкаў, стан большасці параненых не выклікае апасенняў. Ynet адзначае, што трыбуна, якая абвалілася ў сінагозе, была часова ўзведзена для святкавання Шавуот. У момант абрушэння на ёй прысутнічалі сотні людзей. Загінулі два чалавекі — 12-гадовы хлопчык і 40-гадовая жанчына. Пасля абвальвання трыбуны стала вядома, што сінагога не была дабудавана і не мела дазволу на эксплуатацыю.

### Прадстаўніца Мексікі заваявала тытул «Міс Сусвет»



Пераможніцай конкурсу прыгажосці «Міс Сусвет — 2021» стала прадстаўніца Мексікі, паведаміла Associated Press. Адзначаецца, што 26-гадовая Андрэа Меса вывучала праграмаванне і з'яўляецца прафесійным візажыстам, яна займаецца экстрэмальнымі відамі спорту і ўдзельнічае ў рабоце арганізацый, якія змагаюцца за правы жанчын. На фінальным этапе ў барацьбе за карону яна абышла прадстаўніц з Бразіліі, Перу, Дамініканскай Рэспублікі і Індыі. Карону пераможніцы надзела «Міс Сусвет — 2019» з ПАР. Летась конкурс не праводзіўся з-за пандэміі COVID-19. Сёлетні фінал прайшоў у Фларыдзе.

Надвор'е

# СЕЗОН ДАЖДЖОЎ «РАЗЫШОЎСЯ» НЕ НА ЖАРТ

**Сіноптыкі абяцаюць месцамі досыць моцныя ападкі, парывісты вецер і нават істотнае пахаладанне**

**Апошнім часам (у часы глабальнага пацяплення) з надвор'ем назіраюцца нейкія крайнасці. То снегу не было зімой, а ў гэтым сезоне — наце вам! То вясной ранняя засуха, а сёлета — зацяжныя дажджы. Вось і на гэтым тыдні нас чакаюць працяглыя, зусім не вясновыя ападкі, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

На працягу тыдня ў асобныя дні месцамі па краіне чакаюцца моцныя лівні, навальніцы і ўзмацненне ветру да моцнага парывістага. У вільготным паветры ў начныя і ранішнія гадзіны не выключаны туманы.

Сёння днём на большай частцы тэрыторыі краіны таксама пройдуць дажджы, у асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Будзе яшчэ дастаткова цёпла — ад плюс 15 да 21 цяпла, па ўсходзе да плюс 23 градусаў. Амаль паўсюдна будуць ісці дажджы і ў сераду. Месцамі не выключаны навальніцы. Вецер будзе паўночна-заходні ўмераны, удзень парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 8 да 14 градусаў цяпла. Удзень паветра прагрэецца да плюс 12—19 градусаў, па ўсходзе месцамі да 22 цяпла.

Дажджы, месцамі з навальніцамі, чакаюцца і ў чацвер. Вецер прагназуецца паўднёва-заходні ўмераны, удзень месцамі моцны парывісты. Тэмпература паветра ўначы будзе плюс 7—13 градусаў, удзень апусціцца да 10—17 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў сіноптыкаў, у пятніцу ўначы на большай частцы тэрыторыі, а ўдзень месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы ў асобных раёнах моцныя дажджы, магчымыя навальніцы. Тэмпература паветра ў начныя гадзіны будзе вагацца ад плюс 4 градусаў да 10 цяпла. Днём паветра прагрэецца да 11—18 градусаў вышэй за нуль. І ў суботу будзе халаднавата і мокра. У гэты дзень уначы ў асобных раёнах, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца кароткачасовыя дажджы, удзень месцамі навальніцы. Тэмпература паветра ўначы будзе ўсяго толькі 2—8 цяпла, па паўднёвым захадзе да плюс 10 градусаў, а ўдзень — ад плюс 14 градусаў да 21 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ПАМЯЦІ ЛЬВА КОЛАСАВА



У апошні час імя гэтага чалавека ўсё радзей згадвалася ў друку, у розных медыйных рэсурсах. Хоць уклад ганаровага філатэліста Беларускага саюза філатэлістаў у арганізацыю практычнай філатэлістычнай работы, у айчыннае краязнаўства, у гісторыю паштовай справы проста неверагодна вялікі. Нараджэннем з 1932 года, ён, Леў Коласаў, многія дзесяцігоддзі збіраючы паштовыя маркі, знакі паштовай аплаты, надзвычай шмат сіл, старанняў аддаваў прапагандзе менавіта беларускай філатэліі. Пра беларускую пошту, напрыклад, пра легендарныя «слуцкія маркі», пра канверты, штэмпелі, паштовую сувязь былі дзясяткі, калі не сотні яго публікацый. І вось у канцы красавіка (дакладней — 24 красавіка 2021 года) гэтага высакароднага, сціплага чалавека не стала.

А яшчэ зусім нядаўна пра супрацоўніцтва з ім як з аўтарам расказвала ў адным са сваіх інтэрв'ю галоўны рэдактар часопіса «Полымя» Алена Мальчэўская, анансуючы новыя публікацыі літаратурна-мастацкага часопіса, расказваючы пра тое, што было толькі-толькі надрукавана: «...я і сама вельмі парадавалася гэтай публікацыі... Маю на ўвазе ўспаміны нашага выбітнага беларускага філатэліста Льва Коласава. У дзяцінстве ён перажыў фашысцкую акупацыю ў Лунінцы. А за некалькі дзён да вызвалення горада яго сям'ю вывезлі ў працоўны лагер у Германію. Успаміны называюцца «Прынясі малаток!» і распавядаюць пра побыт у тым працоўным лагеры, аднаўляючы яшчэ адну старонку памяці пра вайну. Чытаць надзвычай цікава, бо ў аўтара ўнікальнае светабачанне. Ён фіксуе шмат дэталяў, і чытач можа ў падрабязнасцях усё ўявіць: чым украінскія дзяўчаты ўпрыгожвалі сваё жыллё ў нямецкім палоне, як сам аўтар, хлопчык, быў пакараны за маркі, як працаваў афіцыянтам за недаедзеную ежу, каб выжыць».

І ў апошнія дзесяцігоддзі Леў Коласаў сябраваў з Лунінецкім краем. Ліставаўся з журналісткай Таццянай Канапацкай, шмат спрыяў нараджэнню розных лунінецкіх ініцыятыў.

Добра было б у знак памяці для легендарнага чалавека беларускай культуры, збіральніка памятак пра Беларусь і повязь нашай Айчыны з усім светам выдаць хоць бы невялікую кніжачку мемарыяльнага характару. І з тэкстамі пра самога Льва Коласава, і, несумненна, з яго ўласнымі артыкуламі, «раскіданымі» па розных перыядычных выданнях. Агульнымі шчырымі намаганнямі зрабіць гэта не так ужо і цяжка. А памяць пра філатэліста і краязнаўца застанецца яшчэ на доўгія гады.

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

# У ТЫЛЕ ВОРАГА

## ВЫДАЛА РОДНАЯ ЦЁТКА

Сёння складана ўявіць, што матэрыялы першага падпольнага нумара таемна набіраліся ў нямецкай друкарні — у цяперашнім Доме друку. Напярэдадні першы рэдактар падпольнай «Звязды» Уладзімір Амельянюк устанавіў сувязь з рабочымі друкарні — бацькам і сынам Воранавымі, якія разам з іншымі супрацоўнікамі — Барысам Пупко, Міхаілам Свірыдавым і Броняй Гофман — уваходзілі ў адну з першых падпольных груп Мінска. Падпольшчыкам удалося вынесці з фашысцкай друкарні амаль усё, што патрэбна было для выпуску газеты: наборныя касы, паперу, фарбы, вярстаткі, гранкі... У выніку 18 мая 1942 года дэбютны падпольны нумар «Звязды» быў надрукаваны ў хаце Міхаіла Пятровіча Воранава і яго сына Міхаіла па адрасе Рымарская, 13 (сучасная вуліца Караля).

Некаторыя матэрыялы гэтага выпуску былі напісаны асабіста Уладзімірам Амельянюком. Генадзь Будай, з якім сябравалі, працавалі ў дзяржынскай раённай газеце, вучыліся ў Камуністычным інстытуце журналістыкі, а потым былі сярод арганізатараў патрыятычнага падполля, расказваў, што Уладзімір Сцяпанавіч спяшаўся, рыхтуючы матэрыялы для першага нумара падпольнай «Звязды». «Яго блакнот папаўняўся фактамі аб баявых дзеяннях народных мсціўцаў, аб зверствах фашыстаў, — успамінаў падпольшчык. — Скрупулёзна адбіраў ён найбольш важныя паведамленні Маскоўскага радыё. Шмат якую інфармацыю хацелася змясціць у маленькім газетным лістку. Але трэба было сціскаць, і Амельянюк па некалькі разоў перапісваў матэрыялы, стараўся ўдыхнуць у іх жар свайго сэрца, усю нянавісць да ворага».

Для пошуку падпольнай друкарні з Берліна выклікалі вопытных разведчыкаў. Гітлераўцы ўсведамлялі: разгром самай вядомай і аўтарытэтнай беларускай газеты — органа Мінскага гаркама КП(б)Б — нанясе непапраўны ўрон падпольнаму руху. Тым, хто пакажа, дзе друкуецца нелегальная «Звязда», акупанты абяцалі заплаціць 75 тысяч нямецкіх марак.

Не за грошы, а ратуючы сябе, Воранавых выдала родная цётка: «Яе затрымалі ў краме, у яе было дзесяць картак хлебных, — расказваў падпольшчык Васіль Сайчык. — Спыталі, дзе яна іх бярэ, тая і сказала, што Воранаў даў». Аказалася, што на кватэры ў падпольшчыкаў яшчэ друкаваліся і хлебныя карткі, карткі для дадатковага пайка, пашпарты, біржавыя карткі, даведкі з месца працы, падробліваліся пячаткі і штампы. Менавіта дзякуючы Міхаілу Воранаву мінскім падпольшчыкам удалося здабыць два экземпляры спіса шпіёнаў, якія праз партызанскую брыгаду «Дзядзькі Колі» былі адпраўлены ў Маскву. За гэта, а таксама за ўдзел у выпуску газеты была заплачана вельмі высокая цана: ад рук фашыстаў загінула сям'я з трох чалавек — бацька, сын і яго жонка.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## ПОДЗВІГ СЯМ'І АМЕЛЬЯНЮКОЎ

Трагічна склаўся лёс і ў першага рэдактара падпольнай «Звязды» Уладзіміра Амельянюка. У няпоўныя 25 гадоў учарашні студэнт інстытута журналістыкі ўзначаліў рэдакцыю самай



Уладзімір Амельянюк разам з сынам Генадзем.

вядомай і папулярнай па тым часе беларускай газеты. Праз некалькі дзён пасля выхаду першага нелегальнага нумара (па афіцыйных звестках, 26 мая 1942 года) у ходзе перастрэлкі з агентам СД Уладзімір Амельянюк быў забіты каля Чырвонага касцёла ў Мінску. Аптэка непадалёк ад касцёла, каля якой адбылася трагедыя, была для падпольшчыкаў месцам сустрэчы. У той дзень рэдактар прыйшоў туды на чарговую яўку, якая стала для яго апошняй. У паведамленні аб гібелі малодшага сына, якое маці Амельянюка атрымала з Беларускага штаба партызанскага руху, датай смерці падпольшчыка значыцца 30 мая 1942 года.

— Яго цела ляжала каля аптэкі не адзін дзень, — удакладніла пляменніца рэдактара падпольнай «Звязды» Надзея Амельянюк. — Маці Уладзіміра Амельянюка, мая бабуля, неаднойчы праходзіла каля нежывога сына, але нічога зрабіць не магла: інакш выдала б і сябе, і іншых падпольшчыкаў. Магілы дзядзька не мае...

Няма яе і ў роднай сястры журналіста. Па дарозе ў эвакуацыю ў машыну, у якой ехала Зінаіда Амельянюк, трапіла бомба — жанчына загінула разам з двума дзецьмі. Яе муж, ваеннаслужачы, не вярнуўся з фронту. Бацьку Уладзіміра Амельянюка, Сцяпана Кандратавіча, які таксама супрацоўнічаў з Мінскім падпольным гаркамам КП(б)Б, замучылі ў Трасцянцы. Маці, Паўліна Сцяпанаўна, памерла ўсяго праз некалькі дзён пасля Перамогі: 24 мая 1945 года яна ўпала на вуліцы — жаночае сэрца не вытрымала пакут, якія прынесла іх сям'і вайна.

Уладзімір Амельянюк — адзіны рэдактар у час Вялікай Айчыннай вайны, якому было прысвоена найвышэйшае званне — Герой Савецкага Саюза (падобных прыкладаў у гісторыі СССР не было). На тым месцы, дзе ён загінуў (сучасная плошча Незалежнасці), 24 верасня 1980 года быў адкрыты помнік першаму рэдактару падпольнай «Звязды», а таксама іншым журналістам-падпольшчыкам, якія падчас акупацыі ўдзельнічалі ў выданні газеты.

## БРАТ ГЕРОЯ — «ВОРАГ» НАРОДА

Ва ўсіх дакументальных крыніцах пазначана, што лёс жонкі Уладзіміра Амельянюка Лідзіі і іх сына Генадзя невядомы. І адна з асноўных версій — загінулі падчас Вялікай Айчыннай вайны — пацвердзілася толькі часткова. Па сведчанні пляменніцы журналіста-падпольшчыка, Лідзія і Генадзь Амельянюкі эвакуіраваліся з акупаванага Мінска разам з жонкай і сынам старэйшага брата Героя Савецкага Саюза. «Дзеці, мой родны брат Сярожа і Гена Амельянюк, памерлі па дарозе, — расказала Надзея Амельянюк. — Пасля вайны Ліда выйшла замуж, жыла ў Маскве. Ад другога шлюбу нарадзіла сына. Памятаю, як аднойчы яна прыязджала да нас у вёску. Пакуль была жывая, падтрымлівала стасункі з маёй мамай».



Уладзімір Амельянюк — піянерважаты ў Дзяржынскай сярэдняй школе *(другі ў верхнім радзе).*

Адзіным з Амельянюкоў, над якім злітаваўся лёс, быў старэйшы брат журналіста-падпольшчыка. Але назваць Мікалая Амельянюка шчаслівчыкам наўрад ці справядліва. Для яго вайна пачалася ў 1941-м. Каля Оршы часць, у якой служыў старэйшы Амельянюк, трапіла ў акружэнне. Доўгія тры гады ён знаходзіўся ў палоне, за гэты час змяніў не адзін канцлагер, але выжыў. Пасля вызвалення саюзнікамі трапіў у амерыканскую дывізію, у складзе якой і закончваў вайну. Дамоў вярнуўся ў 1946-м: на Радзіме яго чакаў лёс ворага народа.

Удзельнікам Вялікай Айчыннай Мікалая Амельянюка прызналі амаль напрыканцы жыцця. Ён яшчэ паспеў расказаць пра сваю вайну, пра лёс знакамітага брата: выступаў у дружынах імя Уладзіміра Амельянюка, быў частым госцем у Дзяржынскай школе № 2, дзе будучы герой працаваў піянерважатым, запрашалі яго і ў Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Менавіта туды, не задумваючыся, аддаў Зорку Героя, прысвоеную пасмяротна Уладзіміру Амельянюку да 20-годдзя Перамогі. Пайшоў з жыцця ў 1988 годзе.

Красамоўны факт: Мікалай Амельянюк быў пастаянным падпісчыкам «Звязды», аднак супрацоўнікі газеты доўгі час не ведалі аб яго існаванні. Сціплы чалавек, над якім працяглы перыяд вісела кляймо ворага народа, ніколі не выхваляўся сваім знакамітым братам, гісторыяй подзвігу яго геройчнай сям'і.

## «ЗАЧЫТВАЛІ ДА ДЗІРАК»

Гібель Уладзіміра Амельянюка моцна падкасіла падпольшчыкаў, аднак не зламала — выпуск падпольнай «Звязды» вырашана было працягваць. Усе абавязкі





У гэтай хаце на сучаснай вуліцы Кульман былі выдадзены 2-і і 3-і нумары падпольнай «Звязды». Цяпер на гэтым месцы — помнік.



па падрыхтоўцы чарговага выпуску газеты перайшлі да членаў Мінскага падпольнага гаркама Вячаслава Нікіфарава, Ядвігі Савіцкай і Уладзіміра Казачонка.

Па прычыне таго, што друкарня была перанесена ў іншае месца, а ў працэсе падрыхтоўкі газеты ўзнікалі цяжкасці, другі нумар падпольнай «Звязды» замест ліпеня, як было запланавана, выйшаў у жніўні. Як і трэці, ён быў надрукаваны ў хаце на вуліцы Выдавецкай (цяпер Кульман), дзе гаспадарыла жонка чырвонаармейца Таццяна Якавенка. Адзін з пакояў у жанчыны здымаў Арсеній Грышын, там і размясцілася падпольная друкарня. І гэта нягледзячы на тое, што праз дарогу знаходзілася гестапа! Але немцы нават не здагадваліся, што ў іх пад носам — у суседнім доме — стваралася газета, рэдакцыю якой яны так старанна шукалі.

«Першы час «Звязда» выпускалася нерэгулярна, тыраж яе быў невялікі, але абслугоўвала даволі вялікае кола чытачоў, — расказваў пра газету падпольшчык Георгій Сапун. — Першы, хто яе атрымаў, пасля прачытання перадаваў суседу, знаёмаму, той — іншаму, і так яна ішла па ланцужку і зачытвалася да дзірак. Нярэдка былі выпадкі, калі газета, так ідучы па ланцужку, вярталася зноў у першыя рукі. Але з кожным выданнем тыраж яе рос».

Чацвёрты і пяты (быў падрыхтаваны, але ў сувязі з масавымі арыштамі падпольшчыкаў не выйшаў) нумары «Звязды» ствараліся на кватэры па вуліцы Беламорскай, дзе разам з двума сынамі жылі Пётр і Альбіна Хадасевічы. За дапамогу падпольшчыкам уся сям'я загінула ў Трасцянцы. Акрамя таго, у ноч на 26 верасня гітлераўцы арыштавалі 21 падпольшчыка, сярод якіх быў і Вячаслаў Нікіфараў, на якім у большай ступені ляжала адказнасць за газету. Многіх з арыштаваных закатавалі да смерці, лёс некаторых невядомы дагэтуль...

За выпуск чатырох нумароў «Звязды» ў захопленым ворагам Мінску была заплачана вельмі высокая цана. Аб подзвігу журналістаў-падпольшчыкаў, а таксама тых, хто дапамагаў газеце выходзіць у свет, нагадваюць шматлікія помнікі і мемарыяльныя дошкі, усталяваныя ў розных куточках Мінска, — ні адна газета ў свеце так не ўганаравана. Аднак ні адна газета не мела і такой геройчнай, а разам з тым трагічнай гісторыі.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА і з архіва Надзеі АМЕЛЬЯНЮК.**

# ЗРОБЛЕНА ДЛЯ КРАІНЫ




## Падаткі ад IT-галіны працягваюць расці

**Кампаніі Парка высокіх тэхналогій у першым квартале гэтага года пералічылі ў бюджэт 158 мільёнаў рублёў падаткаў. Гэта амаль у два разы больш, чым летась, паведамляе Міністэрства па падатках і зборах Беларусі. Больш за тое, гэта рэкордная сума падаткаў, якую заплацілі айцішнікі з ПВТ за адзін квартал у апошнія два гады.**

### ДЫНАМІКА РОСТУ

Характэрна, што да гэтага рэкордным быў чацвёрты квартал мінулага года. Тады рэзідэнты Парка заплацілі амаль 124 мільёны рублёў. Але за першыя тры месяцы гэтага года ранейшы рэкорд быў пабіты адразу на 27 %. Як адзначае падатковае ведамства, з аднаго рэзідэнта ПВТ бюджэт атрымаў у студзені–сакавіку ў сярэднім 155 тысяч рублёў падаткаў (амаль 60 тысяч долараў). Гэта на 30 % больш, чым за першы квартал мінулага года, і на 20,5 % больш, чым за чацвёрты квартал 2020 года.

Дарэчы, на падатковыя адлічэнні паўплывалі набор стандартных фактараў: пашырэнне ПВТ за кошт новых рэзідэнтаў, дзейнасць IT-кампаній і рост заробкаў у сектары ў рублях, у тым ліку з улікам росту курсаў замежных валют.

Амаль 90 % усіх пералічаных падаткаў з Парка зарэгістравана ў Мінску. За студзень—сакавік сума выплачаных імі падаткаў вырасла на 81 % да 143,1 мільёна рублёў. Гэта 91 % ад усіх падаткаў, якія заплацілі рэзідэнты ПВТ.

Спецыяліст ПВТ летась заплаціў падаткаў у 3,5 раза больш, чым сярэдні работнік у эканоміцы.

Пра гэта заявіў **дырэктар Парка высокіх тэхналогій Усевалад ЯНЧЭЎСКІ**, які падзяліўся некаторымі цікаўнымі фактамі. Паводле яго інфармацыі, сярэдні работнік кампаніі-рэзідэнта ПВТ заплаціў за мінулы год 6835 рублёў падаходнага падатку. Гэта ў 3,5 раза больш, чым заплаціў сярэдні работнік у эканоміцы.

Усяго за мінулы год рэзідэнты Парка заплацілі ў бюджэт 418 мільёнаў рублёў падаткаў. Гэта на 38 % больш, чым у 2019 годзе. Калі параўнаць ПВТ з органамі дзяржкіравання і арганізацыямі, падпарадкаванымі ўраду, то па суме выплачаных падаткаў Парк — на трэцім месцы. Рэзідэнты ПВТ заплацілі больш падаткаў, чым Мінсувязі, МУС, Мінтранс і іншыя ведамствы.

Экспарт ПВТ за 2020 год перавысіў 2,7 мільярда долараў. Паводле інфармацыі партала dev.by, у нашай краіне сёння застаецца каля 88 % усёй валютнай выручкі. А экспарт камп'ютарных паслуг на душу насельніцтва ў Беларусі складае 224 долары (даныя па выніках 2019 года). Для параўнання: у ЗША гэты паказчык складае 110 долараў, у Індыі — 45 долараў, у Кітаі — 39 долараў.

Характэрна, што летась у Парк уступілі 236 новых рэзідэнтаў, у сакавіку гэтага года — яшчэ 65. Сёння ў ПВТ уваходзіць 1021 кампанія. Цікава, што за апошнія чатыры гады колькасць прадуктовых кампаній у ПВТ вырасла ў 13 разоў.

### ШТО МЫ МОЖАМ?

Беларускія эксперты распрацавалі электронную дэбетавую картку для іспанскага рынку. У планах — запуск электроннага банка на базе рэактыўнага праграмавання.

Фінтэх-кампанія ID Finance з офісам распрацоўкі ў Мінску стварыла для іспанскага рынку пазабанкаўскі прадукт Plazo — электронную дэбетавую картку з магчымасцю авердрафту. Работу над праектам каманда распачала ў жніўні 2020 года, а ў пачатку красавіка адбыўся запуск прадукту. У планах — маштабаваць сэрвіс і на мексіканскі рынак, дзе ID Finance таксама вядзе сваю дзейнасць.

Гэта сапраўды так. Мінск стаў тэхнічным цэнтрам распрацоўкі Plazo. Каманда беларускай IT-кампаніі была ўцягнута ў праект з самага пачатку: пошук вендараў, правядзенне перамоў, абмеркаванне функцыяналу, збор і фармалізацыя патрабаванняў, распрацоўка праекта і яго дадаткаў з нуля.

Зараз распрацаваны дадатак дазваляе ідэнтыфікаваць кліента, выкарыстоўваючы OCR-тэхналогіі, выпусціць віртуальную картку і даць поўны набор неабходнага кліенту функцыяналу для работы з карткамі. Каманда таксама стварыла CRM-сістэму для customer support, рэалізавала тэхнічную магчымасць прывязваць карткі да сэрвісаў ApplePay і GooglePay (GooglePay пакуль не з'явіўся ў Беларусі, але папулярны ў Іспаніі) і афармляць авердрафт. Бяспеку выпуску картак і правядзення транзакцый забяспечвае тэхналагічны партнёр ID Finance-кампанія PeckunPay.

**Характэрна, што летась у Парк уступілі 236 новых рэзідэнтаў, у сакавіку гэтага года — яшчэ 65. Сёння ў ПВТ уваходзіць 1021 кампанія. Цікава, што за апошнія чатыры гады колькасць прадуктовых кампаній у ПВТ вырасла ў 13 разоў.**

— Калі стартуе праект, які арыентаваны на выкарыстанне найноўшых тэхналогій, гэта выклікае цікавасць. Наша каманда змагла прымяніць самыя апошнія тэхналогіі і распрацоўкі і зацягнуць у прадукт тое, што цяпер ёсць на рынку. Так, тэхналогія Terraform апісвае ў выглядзе кода ўсю нашу інфраструктуру і дазваляе хутка нарасціць неабходную колькасць тэставых стэндаў для бяспечнага тэсціравання і тэрміновай дастаўкі функцыяналу на прадакшн. Для распрацоўкі мабільнага дадатку выкарыстоўвалі праграмную платформу Flutter — яна дазваляе запусціць практычна адначасова дадаткі для iOS і Android, бо выкарыстоўваецца адзіная кодавая база. Таксама ў праекце выкарыстаны тэхналогіі рэактыўнага праграмавання, каб забяспечыць максімальную прадукцыйнасць для нашых будучых кліентаў, — распавядае **project-менеджар праекта Es Card кампаніі ID Finance Іван ЗАРЭЦКІ.** Менавіта ён кіруе камандай распрацоўшчыкаў у Мінску.

Plazo дазваляе эмітаваць электронную дэбетавую картку MasterCard (у перспектыве плануецца і VISA) і аформіць на яе аднаўляльную крэдытную лінію (авердрафт). Пасля прадукт можа скласці канкурэнцыю прадуктам неабанкаў N26, Revolut, Bnext, якія даволі паспяхова функцыянуюць на іспанскім рынку. Па словах менеджменту кампаніі, не выключана, што Plazo можа стаць паўнавартасным электронным банкам Іспаніі пасля атрымання e-money license. Электронны банк дазваляе, не выходзячы з хаты, атрымліваць поўны спектр банкаўскіх паслуг анлайн, працуючы без традыцыйных фізічных філіяльных сетак.

**PR-менеджар айчыннай кампаніі Аліна МАЛАХАВА** адзначыла, што сёння ў нашай краіне дзейнічаць банкаўскіх і вакол-банкаўскіх структур могуць весці толькі арганізацыі, якія маюць ліцэнзію на вядзенне дзейнасці катэгорыі «Банк». «Таму казаць аб магчымасцях укаранення ў нашай краіне электроннага банка пакуль, ва ўсякім выпадку, заўчасна. Але, вядома, тэхналогіі так хутка развіваюцца — верагодна, заканадаўства можа змякчыцца, тады такая магчымасць становіцца ўсё больш рэальнай», — адзначыла спецыяліст.

### ВЫЙГРАЦЬ СТАЛІЧНУЮ КВАТЭРУ

А, напрыклад, кампанія ПВТ — LWO — у ліку лідараў па пастаўцы фінансавага прадукту на беларускі рынак. Практычна ўсе банкі краіны — у ліку іх кліентаў. Самы вядомы праект «Аплаці» ўжо шчыльна ўвайшоў у наша паўсядзённае жыццё.

Разлічыцца на адлегласці, атрымаць зніжкі і нават выйграць сталічную кватэру... Больш за 350 000 актыўных карыстальнікаў ужо ацанілі зручнасць і камфорт гэтага дадатку. Сістэма «Аплаці» пабудавана на электронных грошах, гэта больш гнуткая версія плацежных адзінак у адносінах да традыцыйных. Рэальныя грошы пры ўваходзе ў сістэму захоўваюцца ў банку-эмітэнце, а ў сістэме працуюць электронныя.

Адсканаваць QR для разлікаў стала добрым тонам у нашых паўсядзённых рэаліях, каб лішні раз не дакранацца да наяўных грошай і староннiх прадметаў, тым больш у людных месцах. Мабільны тэлефон заўсёды пад рукой, а яшчэ чытае QR з адлегласці больш за два метры. Гэта вельмі зручна ў транспарце, на вакзале або краме, дзе дазваляе трымаць сацыяльную дыстанцыю з касірам у 1,5—2 метры. А яшчэ перадаць грошы адзін аднаму імгненна без камісіі, заправіцца не выходзячы з аўтамабіля...

На першы погляд амаль звычайная мабільная праграма, якіх сёння дзясяткі прапануюць спампаваць у App Store і Play Store, аказваецца сапраўды самастойным арганізмам з мноствам дадатковых і патрэбных у нашым паўсядзённым жыцці зручных магчымасцяў. Прычым кожны ў ёй знойдзе свой набор карысных функцый. А яшчэ з гэтым лёгка эканоміць як звычайнаму карыстальніку, так і бізнесмену. Эквайрынг у «Аплаці. Бізнес» — у сярэднім 0,45 %. Таксама прадпрымальнікам можна стварыць гандлёвую пляцоўку проста ў дадатку, без выдаткаў на сайты і каталогі. Не трэба купляць дарагія тэрміналы — дастаткова мабільнага тэлефона.

Вось так. І ўсё гэта зроблена нашымі айчыннымі айцішнікамі.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Зялёная энергетыка

# ВЯТРАК, які вышэй за піраміду Хеопса

**Паблізу вёскі Капачы ў Мсціслаўскім раёне Магілёўскай вобласці з'явілася новая ветраэнергетычная ўстаноўка. Яна — самая высокая не толькі ў Беларусі, але і на ўсёй прасторы СНД. Праект рэалізаваны дзякуючы партнёрству Белінвестбанка і ЗАТ «РЭАГ Магілёў». Днямі адбыўся запуск і ўвод у эксплуатацыю гэтай магутнай энергетычнай устаноўкі.**

Каб зразумець маштаб аб'екта, дастаткова ўявіць 70-павярховы дом. Вышыня ветраэнергетычнай устаноўкі складае 142 метры, а з улікам лопасцяў — каля 210 метраў. Нават усім вядомая піраміда Хеопса меншая, бо яе вышыня ўсяго 138 метраў. Уражвае і дыяметр мачты ветрака — пяць метраў.

Крыху больш за паўгода спатрэбілася для рэалізацыі праекта. Будаўніцтву ветраэнергетычнай устаноўкі папярэднічала прыцягненне знешніх рэсурсаў банка з выкарыстаннем інструментаў гандлёвага фінансавання.

«Энергаэфектыўныя тэхналогіі спрыяюць скарачэнню выкідаў вугляроду і аказваюць добры ўплыў на змяненне клімату», — адзначыў **старшыня праўлення ААТ «Белінвестбанк» Андрэй БРЫШЦЯЛЁЎ.**

Месца будаўніцтва ветраэнергетычнай устаноўкі — Магілёўская вобласць — было выбрана невыпадкова. У дадзеным раёне размешчана зона актыўнага руху паветраных мас. У выніку больш за палову ўсіх ветракоў краіны прыпадае менавіта на гэтую мясцовасць. Для ўзвядзення найбуйнейшай ветраэнергетычнай устаноўкі была вызначана ўзгорыстая мясцовасць з мноствам натуральных узвышшаў. Дарэчы, яна не перасякаецца са шляхамі міграцыі пералётных птушак.

«За альтэрнатыўнымі крыніцамі энергіі — будучыня, — лічыць **Максім ХАРЫТОН, дырэктар ЗАТ «РЭАГ Магілёў», даччынай структуры швейцарскай кампаніі Terravolt AG.** У цеплавых электрастанцый ёсць перавага, якая заключаецца ў пастаяннай выпрацоўцы электраэнергіі. Аднак у выпадку сур'ёзнага збою альбо непаладак на такіх буйных аб'ектах паралізаванай можа аказацца ўся інфраструктура населенага пункта. Зялёная энергетыка дазваляе пазбегнуць такога сцэнарыя і становіцца па-сапраўднаму незаменнай.

Магутнасць ветраэнергетычнай устаноўкі — 3,4 МВт у гадзіну. Ужо сёння выпрацаваная электраэнергія паступае ў аб'яднаную энергетычную сістэму. Яе галоўнымі спажыўцамі становяцца жылыя дамы і прадпрыемствы найбліжэйшых гарадоў — Крычава, Клімавіч і Мсціслава. Энергіі, атрыманай за адну гадзіну работы ветраэнергетычнай устаноўкі, хапае для таго, каб цэлы месяц забяспечваць электраэнергіяй 10 жылых кватэр або на працягу чатырох дзён увесь Мсціслаўскі раён.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# Адкрылася ўнікальная лабараторыя

**У Магілёве, у Беларуска-Расійскім універсітэце, адкрылася вучэбна-эксперыментальная лабараторыя «Адытыўныя тэхналогіі ў вытворчасці». Гэта стала вынікам удзелу БРУ ў праекце Саюзнай дзяржавы «Развіццё адукацыйнай і навуковай дзейнасці БРУ на базе інавацыйных тэхналогій». А летась у гэтай навучальнай установе адукацыі пачалі рыхтаваць студэнтаў па новай спецыяльнасці «Вытворчасць вырабаў на аснове трохмерных тэхналогій».**



Лабараторыя абсталявана сучаснай тэхнікай для атрымання палімерных вырабаў метадамі адытыўных тэхналогій і даследаванняў і іх механічных уласцівасцяў. Яна ўнікальная тым, што паасобку некаторыя прыборы ёсць у іншых ВНУ краіны, а вось іх поўны набор сабраны толькі ў лабараторыі Беларуска-Расійскага ўніверсітэта. Заняткі будуць накіраваны на набыццё ведаў у сферы лічбавізацыі працэсу, праектавання і стварэнне вырабаў на аснове трохмерных тэхналогій.

Урачыстае адкрыццё і прэзентацыя лабараторыі адбыліся падчас VII Магілёўскага фестывалю навукі.

**Таццяна МАЛІНІНА.**
**Фота аўтара.**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

| |
|---|
| ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 441/С-15681 (назначение – здание неустановленного назначения, наименование – кулинарный комбинат), обшей площадью 914,0 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская область, г. Ивье, ул. 1 Мая, 9. Лот № 1 расположен на земельном участке кадастровый № 422950100001002763, площадью 0,3149 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания кулинарного комбината), расположенном по адресу: Гродненская область, г. Ивье, ул. 1 Мая, 9. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, площадью 0,0112 га. Начальная цена продажи лота 60 732 руб. (шестьдесят тысяч семьсот тридцать два рубля) с учетом НДС. Сумма задатка – 3 036,60 руб. (три тысячи тридцать шесть рублей шестьдесят копеек) |
| Продавец – Вороновский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231391, Гродненская область, г.п. Вороново, ул. Калинина, 4, 8-01594-217-83 |
| Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70 |
| Условия аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – 100 % предоплата. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона |
| Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Аукцион состоится 3 июня 2021 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 208** |
| Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержится на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion. Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звезда» от 28.07.2020 |
| **Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. Последний день приема заявлений – 1 июня 2021 г. до 15.00** |
| *Телефон для справок: 55-87-71– Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»* https://grino.by/aukcion |

## Извещение о проведении аукциона по продаже в частную собственность гражданам земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов. Организатор аукциона – Ивенецкий сельский исполнительный комитет Воложинского района Минской области

| № п/п | Адрес, кадастровый номер участка | Площадь земельного участка, га | Характеристика инженерных коммуникаций | Начальная цена *(бел. руб)* | Задаток 20 % *(бел. руб)* | Затраты на организацию и проведение аукциона *(бел. руб)* |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Гуды (право аренды) кадастровый номер 622084314701000060 | 0,2500 | Подъездные пути, ЛЭП, рядом лес. | 1750 | 350 | 1637,71 + расходы на размещение информации в СМИ |
| 2 | д. Гуды (право аренды) кадастровый номер 622084314701000061 | 0,2500 | Подъездные пути, ЛЭП, рядом лес. | 1750 | 350 | 1607,53 + расходы на размещение информации в СМИ |
| 3 | д. Пряльники, ул. Лесная, кадастровый номер 622084607601000137 | 0,1000 | Подъездные пути, водопровод, газопровод, ЛЭП, рядом лес. Земельный участок имеет ограничения в использовании земель: код-2 | 2420 | 484 | 1530,37+ расходы на размещение информации в СМИ |
| 4 | д. Пряльники, ул. Заречная, 4, кадастровый номер 622084607601000171 | 0,2046 | Подъездные пути, водопровод, газопровод, ЛЭП, рядом лес. Земельный участок имеет ограничения в использовании земель: код-2 | 2420 | 484 | 1530,37+ расходы на размещение информации в СМИ |
| 5 | д. Галимцы, ул. Лесная уч. 40В, кадастровый номер 622084303301000175 | 0,1488 | Вблизи подъездные пути, рядом лес, ЛЭП, газ, земельный участок имеет ограничения прав в использовании земель: водоохранная зона | 3694,70 | 739 | 1618,26 + расходы на размещение информации в СМИ |

Задаток перечисляется на р/с № BY94AKBB36006140305010000000 в ГУ МФ РБ по Минской области ОАО АСБ «Беларусбанк» г. Минск код AKBBBY2X УНП 600537220 Ивенецкий сельский исполнительный комитет. код платежа – 04901.

Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой документации и объявления в газету.

Аукцион состоится 18 июня 2021 года в 10.00 по адресу: Воложинский район, г. п. Ивенец пл. Свободы, 2.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются до 16.06.2020 г. по адресу: Воложинский район, г. п. Ивенец, пл. Свободы, 2. Контактные телефоны: (8 01772) 53388, 51843.

Оплату гарантируем. Наши реквизиты: **р/с № BY94AKBB36006140305010000000 в ГУ МФ РБ по Минской области ОАО АСБ «Беларусбанк» г. Минск код AKBBBY2X УНП 600537220,** Ивенецкий сельский исполнительный комитет.

## ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел. (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**

Продавец: **Хойникское районное потребительское общество** (УНП 400056838) 247618, Гомельская обл., г. Хойники, ул. Жукова, д. 3 в лице ликвидатора Беланова Руслана Николаевича, тел. +375 (29) 690-00-10.

Публичные торги в электронной форме будут проведены: 21 июня 2021 г. 09.00–17.00 на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|
| 1 | Автомобиль GAZ SAZ 3507, рег. знак 0411 ГСМ, 1986 г. в. | 4 560,00 |
| 2 | Автомобиль GAZ 3302 AFIJ LUBAVA, рег. знак АК 7841-3, 2015, г. в. | 18 480,00 |
| 3 | Автомобиль GAZ 3302 BELAVA 1230, рег. знак АК 6326-3, 2014 г. в. | 10 560,00 |
| 4 | Автомагазин МАЗ 437043, рег. знак АЕ5238-3, 2009 г. в. | 10 560,00 |
| 5 | Трансформаторная подстанция ГКТП 202 РЦ04, инв. № 1588 | 6 000,00 |
| 6 | Плуг ПЛН 3-35П инв № 142 | 2 520,00 |
| 7 | Картофелесажалка Л-202, инв. № 33 | 4 680,00 |
| 8 | Холодильная витрина бол., инв № 1204 | 1 800,00 |
| 9 | Холодильная витрина бол., инв № 1205 | 1 800,00 |
| 10 | Холодильная витрина бонета Голд., инв. 1089 | 1 920,00 |
| 11 | Холодильная витрина бонета Миранда., инв. 1027 | 1 920,00 |
| 12 | Павильон тентовый 4,5х6, инв № 1575 | 2 160,00 |
| 13 | Павильон тентовый 4,5х6, инв № 1576 | 2 160,00 |
| 14 | Компрессор инв. № 92, стенд шиномонтажный ОМА-670 инв.93, Установка шиномонтажная инв. № 91 | 2 352,00 |

Местонахождение: п.1-4. г. Хойники, ул. Жукова, д. 3, п. 5-14 г. Хойники, ул. Колесника, д. 63. Телефон для ознакомления и осмотра: тел. +375 (29) 698-53-53.

**Для участия в торгах необходимо в срок** с 19.05.2021 09.00 по 18.06.2021 16.00 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте **BELTORGI.BY**, 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов: не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

## Центр Промышленной Оценки

- **ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ**
- **ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА**

**Извещение о проведении электронных торгов**

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа 5/2, пом. 1703, оф. 5 |
| Продавец | ОАО «Амкодор-Белвар», г. Минск, пр-т Независимости, 58 |
| Оператор ЭТП | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом.1703, оф. 4б |
| Адрес ЭТП | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов (одним лотом) Месторасположение: г. Минск, пр-т Независимости, 58**

| Наименование (назначение) | Общая площадь | Инвентар. номер | Адрес (№ дома) |
|---|---|---|---|
| **Административное помещение** | 3680 кв. м | 500/D-7092850 | 58/2-1 |
| **Помещение неустановленного назначения** | 72,9 кв. м | 500/D-7092856 | 58/2-7 |
| **Помещение неустановленного назначения** | 50,8 кв. м | 500/D-7092857 | 58/2-8 |
| **Складское помещение** | 54,4 кв. м | 500/D-7092855 | 58/2-6 |
| **Помещение неустановленного назначения** | 3,5 кв. м | 500/D-7092853 | 58/2-4 |
| **Складское помещение** | 351,5 кв. м | 500/D-7092854 | 58/2-5 |

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 6 319 650,00 долларов США**

*Примечание: цена продажи Предмета аукциона фиксируется в протоколе о результатах аукциона в сумме в белорусских рублях, эквивалентной цене продажи лота в долларах США по курсу НБРБ на дату проведения аукциона)

**Обременения:** площади зданий частично сданы в аренду. Более подробную информацию по арендаторам можно узнать у организатора аукциона

**Задаток в сумме 790 000,00 бел. руб.** перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в ОАО «Белинвестбанк» (г. Минску), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 30 (тридцать)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **Начало торгов в 11.00 21.06.2021. Окончание торгов в13.00 21.06.2021.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов. |
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 18.06.2021 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06 E-mail: auction@cpo.by** |

## Извещение о проведении электронных торгов

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона и оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом.1703, оф. 4б |
| **Продавец** | ОДО «Меркурий», г. Гомель, ул. Кирова, д. 3, ком. 1-4 |
| **Адрес ЭТП** | www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов**
**Лот №1**
**Адрес: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Кирова, 3-1**

**Административное помещение**
(инв. номер 350/D-6681, общ. пл. 333,1 кв. м)

**Обременения:** площади помещения частично сданы в аренду и находятся в залоге у ОАО «Приорбанк». Более подробную информацию по залогу и арендаторам можно узнать у организатора аукциона.
**Ограничения (обременения)** прав на недвижимое имущество, установленные в связи с присвоением ему статуса памятника историко-культурного наследия. Новый собственник материальной историко-культурной ценности обязан в течение 30 календарных дней со дня приобретения права собственности подписать охранное обязательство. Невыполнение этого требования является основанием для признания сделки недействительной

**Начальная цена лота №1 с НДС 20 % – 990 000,00 бел. руб.**

Лоты № 2-4
Местонахождение: г. Гомель, ул. Севастопольская, 135

| № лота | Наименование | Инвентарный номер | Начальная цена лота с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **2** | **Станок многопильный 4-сторонний МП-9-1675-004** (г. в. 1999) | 00000037 | **5 500,00** |
| **3** | **Точечная сварка ЕТ1818** | 119 | **6 000,00** |
| **4** | **Ванна металлическая для пропитки древесины** | 00000142 | **550,00** |

| | |
|---|---|
| **Условия самовывоза и демонтажа** | демонтаж, разборка, погрузка и транспортировка предмета аукциона проводится за счет покупателя. Продавец и организатор аукциона не оказывают услуг по демонтажу и вывозу предмета аукциона |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа ООО – «ИПМ-Консалт оценка»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона.

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **Начало торгов 22.06.2021 в 11.00 Окончание торгов 22.06.2021 в 12.00** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 21.06.2021 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06 E-mail: info@ipmtorgi.by** |

## ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: ЗАО «Белреализация» (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел. (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY.**

Продавец: КСУП «Вензовец» (УНП 500056209), 231488, аг. Вензовец, ул. Новая, 1в, Дятловского р-на Гродненской обл., тел./факс: +375 1563 67-1-21, 67-1-41, в лице антикризисного управляющего частного предприятия «Правовой путь».

Публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены 8 июня 2021 г. 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена, бел. руб. без НДС. |
|---|---|---|
| 1 | Реконструкция молочнотоварной фермы, Гродненская обл., Дятловский р-н, д. Явор | 286 355,05 |
| 2 | Забор железобетонный (ул. В. Битько), забор железобетонный (ул. Новая), забор железобетонный (аг. Вензовец), асфальтированная дорожка к клубу (аг. Вензовец), туалет | 17 700,00 |

Тел. для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.

Для участия в торгах необходимо в срок с 19.05.2021 09.00 по 07.06.2021 17.00 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте **BELTORGI.BY**, 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 14 календарных дней со дня проведения торгов. Срок оплаты предмета торгов: не позднее 30 календарных дней со дня проведения торгов.

## Уважаемые акционеры ОАО «Стройтрест № 3 Ордена Октябрьской революции»! 24 мая 2021 года в 10.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров.

**Место проведения собрания:** г. Солигорск, ул. Козлова, 37, административное здание Общества, 2-й этаж, актовый зал.

**Повестка дня:**

1. Об учреждении общества с ограниченной ответственностью в Российской Федерации.
2. Об определении местонахождения общества с ограниченной ответственностью.
3. О размере и порядке формирования уставного фонда общества с ограниченной ответственностью.
4. Об утверждении устава общества с ограниченной ответственностью.
5. *О назначении руководителя общества.*
6. *О наделении полномочиями на подписание заявления о государственной регистрации общества.*

С материалами по вопросам повестки дня собрания акционеры могут ознакомиться:

в рабочие дни (понедельник–пятница), начиная с 14 по 21 мая 2021 г. по месту нахождения Общества: г. Солигорск, ул. Козлова, 37, 5-й этаж, кабинет службы менеджмента качества с 10.00 до 16.00 (перерыв на обед – с 13.00 до 14.00), в день проведения собрания 24 мая 2021 года – по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания – с 09.30 до 09.55.

При себе иметь: акционеру – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

Список акционеров будет сформирован по состоянию на 01.05.2021 г.

**УНП 600122771.** **Наблюдательный совет** (8-0174-261754)

## Закон Рэспублікі Беларусь

# Аб недапушчэнні рэабілітацыі нацызму

*Прыняты Палатай прадстаўнікоў 16 красавіка 2021 г.*
*Адобраны Саветам Рэспублікі 21 красавіка 2021 г.*

Дадзены Закон у адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, агульнапрызнанымі прынцыпамі і нормамі міжнароднага права, у тым ліку палажэннямі Статута Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах ад 16 снежня 1966 года, Канвенцыі аб папярэджанні злачынства генацыду і пакаранні за яго ад 9 снежня 1948 года, Канвенцыі аб неўжывальнасці тэрміну даўнасці да ваенных злачынстваў і злачынстваў супраць чалавецтва ад 26 лістапада 1968 года, Міжнароднай канвенцыі аб ліквідацыі ўсіх формаў расавай дыскрымінацыі ад 21 снежня 1965 года, устанаўлівае прававыя і арганізацыйныя асновы дзейнасці па недапушчэнні рэабілітацыі нацызму.

**ГЛАВА 1**
**АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ**

**Артыкул 1. Асноўныя тэрміны, якія прымяняюцца ў гэтым Законе, і іх азначэнні**

Для мэт гэтага Закона прымяняюцца наступныя асноўныя тэрміны і іх азначэнні:

нацызм — таталітарная ідэалогія (дактрына) і практыка яе прымянення гітлераўскай Германіяй, яе саюзнікамі і сатэлітамі з 1933 да 1945 года, звязаныя з таталітарнымі тэрарыстычнымі метадамі ўлады, афіцыйнай градацыяй усіх нацый па ступені паўнавартаснасці, прапагандай перавагі адных нацый над іншымі, якія суправаджаліся злачынствамі супраць міру і бяспекі чалавецтва, ваеннымі і іншымі злачынствамі, устаноўленымі прыгаворам Міжнароднага ваеннага трыбунала для суда і пакарання галоўных ваенных злачынцаў еўрапейскіх краін восі (далей — Міжнародны ваенны трыбунал);

нацысцкая сімволіка і атрыбутыка — сцягі, гімны і іншыя музычныя творы, атрыбуты ўніформы, свастыкі, эмблемы, сімвалы, вымпелы, значкі і іншыя адметныя знакі або іх копіі, якія выкарыстоўваліся Нацыянал-сацыялісцкай рабочай партыяй Германіі, Нацыянальнай фашысцкай партыяй Італіі, іншымі дзяржаўнымі, ваеннымі і іншымі структурамі ці арганізацыямі, якія супрацоўнічалі з такімі структурамі на акупаванай тэрыторыі СССР у гады Другой сусветнай вайны, калі гэтыя структуры і арганізацыі прызнаныя злачыннымі альбо вінаватымі ў здзяйсненні злачынстваў прыгаворам Міжнароднага ваеннага трыбунала альбо прыгаворамі нацыянальных, ваенных ці акупацыйных трыбуналаў, заснаванымі на прыгаворы Міжнароднага ваеннага трыбунала, а таксама іншымі арганізацыямі, якія супрацоўнічалі з такімі структурамі і арганізацыямі, а таксама выявы асоб, прызнаных гэтымі трыбуналамі вінаватымі;

нацысцкія злачынцы — арганізатары, падбухторшчыкі, кіраўнікі ці выканаўцы ваенных злачынстваў і злачынстваў супраць міру і чалавечнасці, якія падлягалі юрысдыкцыі Міжнароднага ваеннага трыбунала; памагатыя нацысцкіх злачынцаў — выканаўцы загадаў нацысцкага рэжыму, ваеннага камандавання вермахта, ваеннаслужачых СС, дапаможнай паліцыі і іх саюзнікаў з ліку насельніцтва акупаваных тэрыторый, якія паступілі добраахвотна ці па прызыве на службу ў названыя падраздзяленні, а таксама іншыя асобы, якія наўмысна садзейнічалі выкананню злачынных загадаў нацысцкіх злачынцаў у любой форме;

рэабілітацыя нацызму — дзеянні, учыненыя публічна альбо з выкарыстаннем публічна дэманстраванага твора, або сродкаў масавай інфармацыі, або глабальнай камп'ютарнай сеткі Інтэрнэт, ці іншай інфармацыйнай сеткі, якія выяўляюцца ў:

апраўданні ідэалогіі (дактрыны) і практыкі нацызму, прызнанні іх правільнымі, якія маюць патрэбу ў падтрымцы і вартыя пераймання, а таксама ў распаўсюджванні ідэалогіі нацызму;

адабрэнні або адмаўленні злачынстваў супраць міру і бяспекі чалавецтва, ваенных і іншых злачынстваў, устаноўленых прысудам Міжнароднага ваеннага трыбунала альбо прысудамі нацыянальных, ваенных або акупацыйных трыбуналаў, заснаванымі на прысудзе Міжнароднага ваеннага трыбунала;

апраўданні асоб і (або) структур або арганізацый, прызнаных злачыннымі альбо вінаватымі ў здзяйсненні злачынстваў прысудам Міжнароднага ваеннага трыбунала альбо прысудамі нацыянальных, ваенных або акупацыйных трыбуналаў, заснаванымі на прысудзе Міжнароднага ваеннага трыбунала, а таксама тых, якія супрацоўнічалі з такімі асобамі і (або) структурамі ці арганізацыямі на акупаванай тэрыторыі СССР у гады Другой сусветнай вайны палітычных і ваенных арганізацый, а таксама асоб, якія ўдзельнічалі ў дзейнасці такіх палітычных і ваенных арганізацый і якія выконвалі альбо наўмысна садзейнічалі выкананню злачынных загадаў асоб і (або) структур або арганізацый, указаных у гэтым абзацы, у любой форме;

гераізацыі нацысцкіх злачынцаў і іх памагатых — наўмысным услаўленні іх, а таксама здзейсненых імі злачынстваў.

Тэрміны «экстрэмізм (экстрэмісцкая дзейнасць)» і «экстрэмісцкае фарміраванне», якія прымяняюцца ў гэтым Законе, маюць значэнні, вызначаныя Законам Рэспублікі Беларусь ад 4 студзеня 2007 года № 203-З «Аб супрацьдзеянні экстрэмізму».

**Артыкул 2. Прававая аснова дзейнасці па недапушчэнні рэабілітацыі нацызму**

Прававую аснову дзейнасці па недапушчэнні рэабілітацыі нацызму складаюць Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, гэты Закон, іншыя акты заканадаўства, а таксама міжнародныя дагаворы Рэспублікі Беларусь.

Калі міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь устаноўлены іншыя правілы, чым тыя, якія ўтрымліваюцца ў гэтым Законе, то прымяняюцца правілы міжнароднага дагавора.

На адносіны, звязаныя з процідзеяннем рэабілітацыі нацызму, не ўрэгуляваныя гэтым Законам, распаўсюджваецца дзеянне заканадаўства аб супрацьдзеянні экстрэмізму.

**Артыкул 3. Асноўныя прынцыпы недапушчэння рэабілітацыі нацызму**

Недапушчэнне рэабілітацыі нацызму грунтуецца на прынцыпах:

захавання гістарычнай памяці і недапушчэння фальсіфікацыі гісторыі, у тым ліку скажэння гістарычных фактаў;

законнасці;

прызнання, захавання і абароны правоў, свабод і законных інтарэсаў грамадзян, а таксама правоў і законных інтарэсаў арганізацый;

спалучэння галосных і негалосных метадаў недапушчэння рэабілітацыі нацызму;

прыярытэту забеспячэння нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь;

супрацоўніцтва дзяржавы з арганізацыямі і грамадзянамі;

прыярытэту прадугледжаных заканадаўствам у сферы прафілактыкі правапарушэнняў мер прафілактыкі правапарушэнняў, накіраваных на выяўленне і ліквідацыю прычын і ўмоў, якія спрыяюць рэабілітацыі нацызму (далей — прафілактычныя меры);

непазбежнасці пакарання за рэабілітацыю нацызму.

**Артыкул 4. Асноўныя напрамкі недапушчэння рэабілітацыі нацызму**

Недапушчэнне рэабілітацыі нацызму ажыццяўляецца праз:

грамадзянскае і патрыятычнае выхаванне дзяцей і моладзі, фарміраванне ў грамадзян духоўна-маральных каштоўнасцяў, грамадзянскасці і патрыятызму;

ажыццяўленне прафілактычных мер;

папярэджанне, выяўленне і спыненне рэабілітацыі нацызму.

**Артыкул 5. Міжнароднае супрацоўніцтва ў галіне недапушчэння рэабілітацыі нацызму**

Рэспубліка Беларусь у адпаведнасці з міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь супрацоўнічае ў галіне недапушчэння рэабілітацыі нацызму з замежнымі дзяржавамі, іх праваахоўнымі органамі, органамі бяспекі і спецыяльнымі службамі, а таксама з міжнароднымі арганізацыямі.

**ГЛАВА 2**
**СУБ'ЕКТЫ ПРОЦІДЗЕЯННЯ РЭАБІЛІТАЦЫІ НАЦЫЗМУ**

**Артыкул 6. Суб'екты процідзеяння рэабілітацыі нацызму**

Агульнае кіраўніцтва дзейнасцю па процідзеянні рэабілітацыі нацызму ажыццяўляюць Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь і Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Каардынацыя дзейнасці суб'ектаў процідзеяння рэабілітацыі нацызму ажыццяўляецца ў парадку, устаноўленым Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, з улікам палажэнняў гэтага Закона.

Суб'ектамі процідзеяння рэабілітацыі нацызму ў межах іх кампетэнцыі з'яўляюцца:

органы ўнутраных спраў;

органы дзяржаўнай бяспекі;

органы пракуратуры;

органы памежнай службы;

мытныя органы;

орган дзяржаўнай аховы;

Следчы камітэт;

рэспубліканскі орган дзяржаўнага кіравання ў сферы культуры;

рэспубліканскі орган дзяржаўнага кіравання ў сферы масавай інфармацыі;

рэспубліканскі орган дзяржаўнага кіравання ў сферы адукацыі;

рэспубліканскі орган дзяржаўнага кіравання па справах рэлігій і нацыянальнасцяў;

Нацыянальная акадэмія навук Беларусі;

органы юстыцыі;

органы фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю;

мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы.

**Артыкул 7. Кампетэнцыя суб'ектаў процідзеяння рэабілітацыі нацызму**

Органы ўнутраных спраў у галіне процідзеяння рэабілітацыі нацызму ажыццяўляюць каардынацыю дзейнасці суб'ектаў процідзеяння рэабілітацыі нацызму, іншых дзяржаўных органаў і іншых арганізацый, у тым ліку ў частцы паўнаты і своечасовасці рэалізацыі імі сваіх паўнамоцтваў у галіне процідзеяння рэабілітацыі нацызму.

Органы ўнутраных спраў, дзяржаўнай бяспекі ў галіне процідзеяння рэабілітацыі нацызму ў парадку, устаноўленым заканадаўствам:

ажыццяўляюць прагназаванне сацыяльна-палітычнай сітуацыі;

ажыццяўляюць інфармацыйнае і іншае забеспячэнне дзейнасці Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь;

забяспечваюць ажыццяўленне на планавай міжведамаснай аснове прафілактычных мер.

Органы ўнутраных спраў, дзяржаўнай бяспекі, фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю, памежнай службы, мытныя органы, орган дзяржаўнай аховы ў галіне процідзеяння рэабілітацыі нацызму ў межах сваёй кампетэнцыі ажыццяўляюць прафілактычныя меры і іншыя паўнамоцтвы ў адпаведнасці з заканадаўствам.

Органы пракуратуры пры выяўленні фактаў парушэння заканадаўства ў галіне процідзеяння рэабілітацыі нацызму, а таксама пры атрыманні звестак аб такіх фактах рэалізуюць паўнамоцтвы па супрацьдзеянні рэабілітацыі нацызму ў адпаведнасці з гэтым Законам і іншымі актамі заканадаўства, а таксама ажыццяўляюць крымінальны пераслед асоб, якія ўчынілі злачынствы, звязаныя з рэабілітацыяй нацызму, і іншыя паўнамоцтвы ў адпаведнасці з заканадаўствам.

Следчы камітэт ажыццяўляе крымінальны пераслед асоб, якія ўчынілі злачынствы, звязаныя з рэабілітацыяй нацызму, у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі.

Рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання ў сферах культуры, масавай інфармацыі і адукацыі, а таксама Нацыянальная акадэмія навук Беларусі рэалізоўваюць паўнамоцтвы ў галіне процідзеяння рэабілітацыі нацызму ў адпаведнасці з гэтым Законам і іншымі актамі заканадаўства.

Міністэрства юстыцыі, адпаведныя ўпраўленні юстыцыі, рэспубліканскі орган дзяржаўнага кіравання па справах рэлігій і нацыянальнасцяў, мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы ў межах сваёй кампетэнцыі ажыццяўляюць кантроль за адпаведнасцю дзейнасці палітычных партый, прафесійных саюзаў, іншых грамадскіх аб'яднанняў, рэлігійных арганізацый заканадаўству аб супрацьдзеянні рэабілітацыі нацызму і іх статутам.

Мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы ўдзельнічаюць у процідзеянні рэабілітацыі нацызму ў межах сваёй кампетэнцыі.

Суб'екты процідзеяння рэабілітацыі нацызму накіроўваюць інфармацыю аб прымяненні мер процідзеяння рэабілітацыі нацызму ў Міністэрства ўнутраных спраў у парадку, устаноўленым Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 8. Паўнамоцтвы іншых дзяржаўных органаў і іншых арганізацый у галіне процідзеяння рэабілітацыі нацызму**

Дзяржаўныя органы, не названыя ў артыкуле 6 гэтага Закона, і іншыя арганізацыі ажыццяўляюць прафілактычныя меры, удзельнічаюць у выяўленні і спыненні рэабілітацыі нацызму, а таксама аказваюць садзейнічанне суб'ектам процідзеяння рэабілітацыі нацызму ў межах сваёй кампетэнцыі, устаноўленай гэтым Законам і іншымі актамі заканадаўства.

**ГЛАВА 3**
**ПРАФІЛАКТЫКА РЭАБІЛІТАЦЫІ НАЦЫЗМУ.**
**МЕРЫ ПРОЦІДЗЕЯННЯ РЭАБІЛІТАЦЫІ НАЦЫЗМУ**

**Артыкул 9. Асноўныя напрамкі прафілактыкі рэабілітацыі нацызму**

У мэтах процідзеяння рэабілітацыі нацызму дзяржаўныя органы, у тым ліку мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, у межах сваёй кампетэнцыі ажыццяўляюць прафілактычныя меры, накіраваныя на папярэджанне рэабілітацыі нацызму.

Прафілактыка рэабілітацыі нацызму ажыццяўляецца па наступных асноўных напрамках:

маніторынг выканання заканадаўства ў частцы недапушчэння рэабілітацыі нацызму;

фарміраванне ў грамадстве нецярпімасці да нацызму і яго рэабілітацыі;

стварэнне і распаўсюджванне, у тым ліку ў глабальнай камп'ютарнай сетцы Інтэрнэт, інфармацыйнай прадукцыі ў мэтах недапушчэння рэабілітацыі нацызму;

супрацьдзеянне рэабілітацыі нацызму пры ўвекавечанні памяці загінулых;

садзейнічанне дзейнасці, якая спрыяе праслаўленню перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, у галіне тэатральнага, музычнага, цыркавога і выяўленчага мастацтва, бібліятэчнай справы, кінематаграфічнай дзейнасці, музейнай справы, арганізацыі і правядзення культурна-відовішчных і іншых культурных мерапрыемстваў, выдавецкай справы, адукацыйнай і навуковай дзейнасці.

**Артыкул 10. Маніторынг выканання заканадаўства ў частцы недапушчэння рэабілітацыі нацызму**

Маніторынг выканання заканадаўства ў частцы недапушчэння рэабілітацыі нацызму, у тым ліку заснавальнікамі, рэдакцыямі сродкаў масавай інфармацыі, уладальнікамі інтэрнэт-рэсурсаў, журналістамі, аўтарамі інфармацыйных паведамленняў і матэрыялаў, ажыццяўляецца ў парадку, устаноўленым Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 11. Процідзеянне рэабілітацыі нацызму пры ўвекавечанні памяці загінулых**

Утрыманне і ўход за воінскімі пахаваннямі і пахаваннямі ахвяр войнаў ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам у галіне пахавання і пахавальнай справы пры ўмове, што ўстаноўленыя надмагільныя збудаванні, якія ўвекавечваюць памяць загінулых, не ўтрымліваюць прыкмет рэабілітацыі нацызму.

Стварэнне мемарыяльных музеяў, устанаўленне на месцах баявых дзеянняў памятных знакаў, арганізацыя выставак, ахова і ўладкаванне тэрыторый, звязаных з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны (Другой сусветнай вайны), не павінны быць накіраваны на фарміраванне пазітыўнага стаўлення да ідэалогіі нацызму, гераізацыю нацысцкіх злачынцаў і іх памагатых.

**Артыкул 12. Меры процідзеяння рэабілітацыі нацызму**

Да мер процідзеяння рэабілітацыі нацызму адносяцца:

афіцыйнае папярэджанне;

прадпісанне;

прыпыненне дзейнасці арганізацыі, прадстаўніцтва замежнай або міжнароднай арганізацыі, індывідуальнага прадпрымальніка, дзейнасць якіх накіравана на рэабілітацыю нацызму;

прызнанне арганізацыі, зарэгістраванай на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, дзейнасць якой накіравана на рэабілітацыю нацызму, экстрэмісцкай, забарона яе дзейнасці і ліквідацыя такой арганізацыі;

прызнанне дзейнасці індывідуальнага прадпрымальніка, дзейнасць якога накіравана на рэабілітацыю нацызму, экстрэмісцкай і яе спыненне;

процідзеянне дзейнасці экстрэмісцкіх фарміраванняў, дзейнасць якіх накіравана на рэабілітацыю нацызму;

забарона дзейнасці экстрэмісцкіх замежных і міжнародных арганізацый, дзейнасць якіх накіравана на рэабілітацыю нацызму;

супрацьдзеянне фінансаванню рэабілітацыі нацызму;

іншыя меры процідзеяння рэабілітацыі нацызму, прадугледжаныя заканадаўствам аб супрацьдзеянні экстрэмізму.

Парадак прымянення мер процідзеяння рэабілітацыі нацызму вызначаецца ў адпаведнасці з заканадаўствам аб супрацьдзеянні экстрэмізму.

Рэабілітацыя нацызму, фінансаванне рэабілітацыі нацызму, дзейнасць арганізацыі, прадстаўніцтва міжнароднай або замежнай арганізацыі, індывідуальнага прадпрымальніка, накіраваная на рэабілітацыю нацызму, прапаганда або публічнае дэманстраванне, у тым ліку з выкарыстаннем глабальнай камп'ютарнай сеткі Інтэрнэт альбо іншай інфармацыйнай сеткі, выраб, распаўсюджванне нацысцкай сімволікі і атрыбутыкі, а таксама захоўванне або набыццё такой сімволікі і атрыбутыкі ў мэтах распаўсюджвання забараняюцца, за выключэннем выпадкаў публічнага дэманстравання, вырабу, распаўсюджвання нацысцкай сімволікі і атрыбутыкі, а таксама захоўвання або набыцця такой сімволікі і атрыбутыкі ў мэтах распаўсюджвання пры ажыццяўленні ў адпаведнасці з заканадаўствам дзейнасці ў галіне тэатральнага, музычнага, цыркавога і выяўленчага мастацтва, бібліятэчнай справы, кінематаграфічнай дзейнасці, музейнай справы, арганізацыі і правядзення культурна-відовішчных і іншых культурных мерапрыемстваў, выдавецкай справы, адукацыйнай і навуковай дзейнасці, калекцыянавання культурных каштоўнасцяў, сродкаў масавай інфармацыі пры адсутнасці прыкмет прапаганды нацысцкай сімволікі і атрыбутыкі.

Пералікі арганізацый і іншых структур, названых у абзацы трэцім часткі першай артыкула 1 гэтага Закона, нацысцкай сімволікі і атрыбутыкі вызначаюцца Міністэрствам унутраных спраў па ўзгадненні з Міністэрствам юстыцыі, Камітэтам дзяржаўнай бяспекі і Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі.

**ГЛАВА 4**
**КАНТРОЛЬ ЗА ДЗЕЙНАСЦЮ СУБ'ЕКТАЎ ПРОЦІДЗЕЯННЯ РЭАБІЛІТАЦЫІ НАЦЫЗМУ. НАГЛЯД ЗА ВЫКАНАННЕМ ЗАКАНАДАЎСТВА Ў ГАЛІНЕ ПРОЦІДЗЕЯННЯ РЭАБІЛІТАЦЫІ НАЦЫЗМУ. АДКАЗНАСЦЬ ГРАМАДЗЯН ЗА РЭАБІЛІТАЦЫЮ НАЦЫЗМУ, ПРАПАГАНДУ АБО ПУБЛІЧНАЕ ДЭМАНСТРАВАННЕ, ВЫРАБ, РАСПАЎСЮДЖВАННЕ НАЦЫСЦКАЙ СІМВОЛІКІ І АТРЫБУТЫКІ**

**Артыкул 13. Кантроль за дзейнасцю суб'ектаў процідзеяння рэабілітацыі нацызму**

Кантроль за дзейнасцю суб'ектаў процідзеяння рэабілітацыі нацызму ажыццяўляюць Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, а таксама Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь у межах сваіх паўнамоцтваў.

**Артыкул 14. Нагляд за выкананнем заканадаўства ў галіне процідзеяння рэабілітацыі нацызму**

Нагляд за выкананнем заканадаўства ў галіне процідзеяння рэабілітацыі нацызму ажыццяўляюць Генеральны пракурор і падпарадкаваныя яму пракуроры.

**Артыкул 15. Адказнасць грамадзян за рэабілітацыю нацызму, прапаганду або публічнае дэманстраванне, выраб, распаўсюджванне нацысцкай сімволікі і атрыбутыкі**

За рэабілітацыю нацызму, прапаганду або публічнае дэманстраванне, у тым ліку з выкарыстаннем глабальнай камп'ютарнай сеткі Інтэрнэт альбо іншай інфармацыйнай сеткі, выраб, распаўсюджванне нацысцкай сімволікі і атрыбутыкі, а таксама захоўванне або набыццё такой сімволікі і атрыбутыкі ў мэтах распаўсюджвання грамадзяне нясуць адказнасць у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі.

**ГЛАВА 5**
**ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ**

**Артыкул 16. Меры па рэалізацыі палажэнняў гэтага Закона**

Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь у месячны тэрмін прыняць меры па рэалізацыі палажэнняў гэтага Закона.

**Артыкул 17. Уступленне ў сілу гэтага Закона**

Гэты Закон уступае ў сілу ў наступным парадку:

артыкулы 1—15 — праз месяц пасля афіцыйнага апублікавання гэтага Закона;

іншыя палажэнні — пасля афіцыйнага апублікавання гэтага Закона.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

*14 мая 2021 г., г. Мінск*
*№ 103-З*

# ПАДОРЫМ РАДАСЦЬ ДЗЕЦЯМ

## Для добрых спраў не трэба асаблівых выдаткаў

**Беларускі саюз жанчын на выхадных распачаў рэспубліканскую акцыю «Дорым радасць», прысвечаную Міжнароднаму дню абароны дзяцей. Падчас акцыі члены арганізацыі і валанцёры плануюць навесці парадак на дзіцячых пляцоўках.**

Самі члены прэзідыума Беларускага саюза жанчын на чале са **старшынёй БСЖ, першым намеснікам міністра аховы здароўя Аленай БОГДАН** узялі ўдзел у добраўпарадкаванні дваровай тэрыторыі ў Маскоўскім раёне Мінска. Да добраўпарадкавання далучыліся і прадстаўнікі мясцовай улады. Жанчыны займаліся афарбоўкай абсталявання і пасадкай кветак. Абнавілі не толькі спартыўны інвентар, горкі і пясочніцы, але і лаўкі.

Работа ў той дзень кіпела і ў іншых дварах ва ўсіх абласных цэнтрах. У Брэсце акцыю распачалі на тэрыторыі цэнтра карэкцыйна-развіццёвага навучання, у Віцебску — у двары па вуліцы Смаленскай, у Гомелі — на Рэчыцкім праспекце.

У Гродне ў двары па вуліцы Валковіча, дзе знаходзіцца чатыры дзіцячыя дамы сямейнага тыпу, не толькі пафарбавалі гульнявое абсталяванне, але і правялі забаўляльную праграму для дзяцей. Яркія казачныя персанажы спявалі і танцавалі, а пад канец праграмы пачаставалі малых марожаным.

У Магілёве добраўпарадкоўвалі прылеглую тэрыторыю дома па Віцебскім праспекце. Высаджвалі шарападобную вярбу, бэз і іншую зеляніну, прыводзілі ў парадак клумбы, падфарбоўвалі бардзюры.

У выхадныя мерапрыемствы акцыі адбыліся і ў некаторых раённых гарадах і пасёлках, але ў асноўным добраўпарадкаванне ў іх будзе весціся ў наступныя дні і да 1 чэрвеня.

Старшыня Беларускага саюза жанчын адзначыла, што акцыя пройдзе па ўсёй краіне, а дзясяткі пляцовак для дзіцячага адпачынку і гульняў, дзякуючы гэтаму праекту, будуць акуратны і дагледжаны выгляд.

«Сёння мы хочам паказаць, што для таго, каб навесці парадак, патрэбны толькі жаданне і добрае сэрца. Мы запрашаем да гэтай акцыі абсалютна ўсіх. Прыходзьце, пакажыце на справе, што такое клопат пра дзяцей. Бо для добрых спраў не трэба нейкіх асаблівых выдаткаў. Самае галоўнае — мець жаданне парадаваць радасць дзецям», — адзначыла Алена Багдан.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**



Фота БелТА.

Прафарыенцір

# РАСКРЫЙ СВОЙ ТАЛЕНТ!

**На факультэце журналістыкі БДУ прайшоў Дзень дзіцячай журналістыкі. У яго межах адбылося ўзнагароджанне пераможцаў Рэспубліканскага конкурсу юных карэспандэнтаў і Рэспубліканскага фотаконкурсу для школьнікаў, а таксама ўручэнне сертыфікатаў удзельнікам Школы маладога журналіста.**



Фота з сайта факультэта журналістыкі БДУ.

Мерапрыемства прымеркавана да 100-годдзя Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Да ўдзелу ва ўзнагароджанні былі запрошаны школьнікі ва ўзросце ад васьмі да сямнаццаці гадоў з усёй краіны, якія сталі найлепшымі.

— Журналістыка — гэта вельмі важная сфера ў нашым жыцці. Журналісты не толькі адлюстроўваюць яго, але і ствараюць рэчаіснасць, уплываюць на нашы думкі, настрой. Большасць з вас прыйдзе да нас на факультэт і ў далейшым стане будучыняй нацыянальнай журналістыкі. Вельмі хочацца, каб вашы таленты сапраўды раскрыліся, каб вы знайшлі месца ў сваім жыцці, рэалізаваліся ў нашай краіне, — адкрыла сустрэчу **дэкан факультэта журналістыкі Вольга САМУСЕВІЧ.**

У конкурсе юных карэспандэнтаў прынялі ўдзел больш за 60 юнакоў і дзяўчат. Яны дасылалі работы, прысвечаныя памятным і гістарычным мясцінам Беларусі, жыхарам рэгіёна, актуальным падзеям у жанрах рэпартажу, інтэрв'ю, публіцыстычнага эсэ і іншых. 29 канкурсантаў сталі пераможцамі, сем атрымалі спецыяльныя прызы. У фотаконкурсе ўдзельнічалі каля 80 школьнікаў. Маладыя людзі прадставілі каля 120 фотаработ у трох намінацыях: «Публікацыя», «Відэа- і аўдыясюжэт», «Блог», якія ўжо былі апублікаваны ў СМІ ці размешчаны на лічбавых платформах. Юныя фатографы дасылалі здымкі на тэмы «Прырода», «Людзі» і «Невядомая Беларусь», найлепшымі сталі 13 чалавек. Студэнты-валанцёры факультэта журналістыкі таксама падвялі вынікі сваёй работы за вучэбны год з абітурыентамі ў Школе маладога журналіста, дзе навучалася больш за 60 прадстаўнікоў школ, гімназій і ліцэяў краіны.

— Падчас работы Школы маладога журналіста мы актыўна рыхтавалі абітурыентаў да выступлення. Слухачы мелі магчымасць папоўніць сваё партфоліа конкурснымі эсэ, фатаграфіямі і новымі артыкуламі. Упершыню на факультэце журналістыкі ў рамках 78-й студэнцкай канферэнцыі прайшла секцыя «Медыядаследаванні юных». Самыя актыўныя ўдзельнікі Школы былі ўзнагароджаны сертыфікатамі, — адзначыла **валанцёр Школы маладога журналіста студэнтка факультэта журналістыкі БДУ Ксенія СІТНІК.**

Продавец: ОАО «Рапс» (УНП 600068480) Минский р-н, аг. Крупица, ул. Садовая, 20, тел. 8017 506-91-51.

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены: **2 июня 2021 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

Предмет торгов – ***<u>здание специализированное животноводства (здание коровника)</u>*** с инв. №600/С-121229, пл. 1 788,0 кв. м, Минская обл., Минский р-н, Крупицкий с/с, 12, район д. Дедовка. Начальная цена предмета торгов – 104 936,04 бел. руб. с НДС. Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Тел. для ознакомления и осмотра +37529 785-81-56.

**Для участия в торгах необходимо в срок** <u>с 19.05.2021 9.00 по 01.06.2021 17.00</u> 1) зарегистрироваться и подать заявку на участие в торгах по выбранному лоту на сайте **BELTORGI.BY**, 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, оплатить аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок оплаты предмета торгов – возможна рассрочка платежа на 3 года. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 26.03.2021.

# ПТУШКА ШЧАСЦЯ

## Курыца: «фабрычная» або вясковая?

**Курыца — самая папулярная і даступная сёння па цане мясная страва. Мы ўдакладнілі цэны на яе на рынках і ў крамах, спыталіся ў прадаўцоў, ці падаражэла «птушка шчасця» апошнім часам, а таксама высветлілі, як яе правільна выбіраць.**

Не сакрэт, што рацыён людзей з высокім узроўнем матэрыяльнага дастатку адрозніваецца ад меню тых, хто жыве ад зарплаты да зарплаты. Яшчэ больш уражвае розніца ў меню жыхароў розных краін. Асабліва калі казаць пра мяса. У Карэі ядуць сабак, у Манголіі — каніну, у Судане — кракадзілаў, у Тайландзе — змей. Індусы не ядуць ялавічыну, а мусульмане — свініну. А вось курыцу любяць усе. Яе гатуюць у любым пункце планеты, яна прысутнічае ў меню мішленаўскіх рэстаранаў і ларкоў фастфуду. Не так даўно брытанскае выданне The Economist прысвяціла даследаванне асаблівасцям спажывання мяса ў розных краінах свету. Паводле яго вынікаў, курыца стала абсалютным лідарам сярод відаў мяса, якім аддае перавагу насельніцтва планеты. Што нядзіўна, улічваючы яе вартасці. Курыныя крылцы — і выдатная закуска да піва, і вячэра для ўсёй сям'і. Калі вы аматар правільнага харчавання — вучыцеся гатаваць курыную грудку тысячай і адным спосабам. Паненкі, што худзеюць да лета, могуць прыняць да ведама, што нават каларыйнасць курынай ножкі — самай багатай калорыямі часткі тушкі — не перавышае 156 ккал (праўда, без скуры). А эканомныя гаспадыні — што курыная тушка выкарыстоўваецца ў ежу практычна цалкам, нават лапы і грабеньчыкі можна адправіць у суп або халадзец.

## КАРЫСЦЬ ЦІ ШКОДА?

У ідэале, курынае мяса — крыніца цэлага спектра неабходных для здароўя чалавека бялкоў, вітамінаў, мінералаў і амінакіслот. Гадоў 30 таму курыца, па сутнасці, у нашай краіне была па-за канкурэнцыяй для сярэднестатыстычнага гараджаніна. Сёння яна паспяхова вытрымлівае канкурэнцыю за нашы талеркі з іншай сельскагаспадарчай птушкай — ад індычкі і гусака да качкі і перапёлкі. Самае каштоўнае ў мясе птушкі — бялок. У мясе курэй ён складае каля 20 % (столькі ж у індычыне), у мясе качкі і гусака яго менш — 17 і 15 % адпаведна. Пры гэтым утрыманне тлушчу ў курыным мясе не перавышае 10 %, у мясе вадаплаўных птушак тлушчу нашмат больш (тушка гусака ў сярэднім на 30 % складаецца з тлушчу, качкі — на 25—27 %). Да таго ж кураціна змяшчае поліненасычаныя тлустыя кіслоты і з'яўляецца сродкам прафілактыкі ішэмічнай хваробы сэрца, інфаркту міякарда, гіпертаніі, інсульту. Бялок курынага мяса пастаўляе ў арганізм 92 % патрэбных чалавеку амінакіслот (для параўнання: у бялку свініны 88 % амінакіслот), таксама курынае мяса змяшчае вітаміны групы B ($B_2$, $B_6$, $B_9$, $B_{12}$), фосфар, селен, кальцый, магній і медзь.

**Цэны на «натуральную» курыцу адрозніваюцца ад цэн на фабрычныя бройлеры вельмі істотна.**

Але гэта ў ідэале. На практыцы ўсё крыху інакш. Як вядома, курынае мяса назапашвае антыбіётыкі і іншыя дабаўкі з корму птушак — і, як вынік, людзі, што часта ядуць курыцу, атрымліваюць устойлівасць да антыбіётыкаў. Інфекцыяністы пішуць, што многія антыбіётыкі на сучаснага чалавека ўжо проста не дзейнічаюць. Дабаўкі (тыя ж антыбіётыкі) з'яўляюцца ў харчаванні куранят на птушкафабрыках ужо ў першыя дні жыцця. За два тыдні да забою, згодна з санітарнымі нормамі, такія дабаўкі перастаюць выкарыстоўваць у харчаванні птушак — за гэты перыяд арганізм курыцы павінен «ачысціцца» ад лекаў, каб яе мяса трапіла на стол без «хіміі». Дарэчы, з курыных субпрадуктаў медыкі рэкамендуюць з асцярожнасцю ставіцца да печані бройлерных курэй: яна актыўна «збірае» таксіны. Лепш аддаць перавагу страўнічкам і сэрцайкам. А самая бяспечная частка курынай тушкі — крылы, яны назапашваюць менш шкодных рэчываў, чым іншыя часткі. Калі не казаць пра печань, то больш за ўсё «хіміі» ў курыцы ўтрымлівае сцягно. Ну, і, зразумела, скура — медыкі папярэджваюць, што шкодныя рэчывы, якія траплялі ў арганізм курыцы на працягу яе жыцця, больш за ўсё назапашваюцца менавіта ў скуры. Пры варэнні булёну з курыцы з птушкафабрыкі спецыялісты па правільным харчаванні раяць двойчы зліваць ваду пасля закіпання.



Цэны на курыцу з птушкафабрыкі на рынку і ў буйных сеткавых крамах супастаўныя, хоць «раздзелка» ў магазіне можа абысціся крыху даражэй.

## САМАЯ ЛЮБІМАЯ

«Курыныя» прылаўкі — найбольш прыцягальныя на «Камароўцы»: там нават у няўдалыя для прадаўцоў дні ёсць пакупнікі.

— Асабліва добра бяруць курыцу кускамі і каўбаскі ў сезон, — расказвае прадавец курыцы ад СВК «Сноў». — А сезон у нас летам, калі пачынаецца час шашлыкоў.

Па прыбытковасці птушкагадоўля — адзін з лідараў сельскагаспадарчай галіны. Ад кураняці-бройлера, што толькі вылупіўся з яйка, да тушкі на прылаўку праходзіць усяго 45 дзён. У курыц ёсць пароды — яечныя, мясныя, мяса-яечныя. Дзве астатнія групы парод (дэкаратыўныя і байцовыя) для звычайнага спажыўца цікавасці не ўяўляюць. Але менавіта з гэтай апошняй групы пачалася гісторыя дамашніх курэй. Чалавецтва прыручыла курэй (адбылося тое ў Паўднёва-Усходняй Азіі больш за 7000 гадоў таму) зусім не для ежы. Чырвоных джунглевых курэй людзі прыручылі для арганізацыі пеўневых баёў. І менавіта з тых птушак бяруць пачатак звыклыя для нас куры.

Зрэшты, пакупніку бліжэй падзел курэй на катэгорыі па ўкормленасці.

— Тушкі першай катэгорыі — гэта добра развітая мышачная тканка, форма грудной часткі тушак бройлераў, куранят і курэй круглая, скура чыстая, без разрываў і плям, пуху і «пянькоў», — тлумачыць прадавец Таццяна. — У тушак другой катэгорыі кіль грудной косткі можа вылучацца, дапускаецца нязначная колькасць «пянькоў» на скуры і разрываў скуры.

Цэны на курыцу на рынку залежаць ад пастаўшчыка, кажуць прадаўцы. Прыемна, што курыца ў апошні час, па іх словах, не падаражэла. Адзінае, што падаражэла з сырых «курыных» прадуктаў — гэта філе, адзначаюць яны. Цэны на курыцу на «Камароўцы» сёння такія: кураняты-бройлеры — 4,26—4,30, філе — 8,20—8,30, грудка — 5,78—5,80, сцягно — у сярэднім 5,80, крыло і галёнка — у сярэднім па 4,40, спінкі — ад 1,6 да 2,90. Субпрадукты: печань — 4,30 за кілаграм, сэрцайкі — каля васьмі рублёў за кілаграм, страўнікі — у межах трох рублёў за кілаграм.



У буйных сеткавых крамах курыная тушка супастаўная па цане, а па частках — крыху даражэй. Тушка астуджаная ва ўпакоўцы — ад 4,55 да 4,70, курынае філе — у межах 8,50—9,25 рублёў за кілаграм, грудка — 6—6,50, галёнка — 4,99—5,35, сцягно — 5,89, 5,99—6 рублёў — кумпячкі, 4,55—4,89 — крылы. Субпрадукты: печань курыная — 2,79 за ўпакоўку па 550 г, страўнікі 2,25 за тую ж вагу. Замарожаныя спінкі і шыі можна купіць у сярэднім па цане каля двух рублёў за кілаграм.

Дарэчы, аб замарожанай птушцы. На рынках прадаюць у асноўным астуджаную курыцу. Замарожаную можна знайсці ў крамах, але яна не карыстаецца попытам. «Замарозка» прадаецца танней, але падчас размарозкі такая птушка страчвае досыць шмат вагі — каля 200 г тушкі можа «выйсці» з вадой. Астуджаную курыцу лепш за ўсё гатаваць у той жа дзень, у які вы прынеслі яе з рынку.

## ВЯСКОВАЯ ЛЕПШАЯ?

Дыетолагі пішуць аб тым, што з-за ненатуральных умоў утрымання птушак на птушкафабрыках, цеснаты, недахопу фізічнай актыўнасці, у крыві курэй падае колькасць эрытрацытаў і мяса страчвае як у смаку, так і ў карыснасці ў параўнанні з дамашнімі курамі. «Хатнія» або фермерскія куры жывуць у больш натуральных умовах (свабодна перасоўваюцца па двары або птушніку, дзяўбуць збожжа, семечкі і чарвякоў, дыхаюць чыстым загарадным паветрам). Адпаведна, іх мяса больш карыснае? Не факт. Па-першае, вышэйпералічанае датычыцца цёплай пары года, зімой фермерскія і «хатнія» куры, часцей за ўсё, ядуць той жа камбікорм, што і іх «браты» з птушкафабрык. Так што раскашэльвацца на «вясковую» курыцу варта, мабыць, толькі летам, ранняй восенню і позняй вясной. У талерцы адрозніць сапраўдную «вясковую» курыцу нескладана: у яе больш шчыльнае мяса і, галоўнае, вельмі цвёрдыя ў параўнанні з «фабрычнай» птушкай косткі. У курэй з птушкафабрык косткі тонкія (з-за дабавак — у прыватнасці, фасфату натрыю), а мяса — мяккае.

Цэны на «натуральную» курыцу адрозніваюцца ад цэн на фабрычныя бройлеры вельмі істотна. Супавыя куры прадаюцца па 14 рублёў за кілаграм, а бройлеры, выгадаваныя ў дамашніх умовах, — па 15. Адна курыца «пацягне» на 25-27 рублёў. Крыху далей па гандлёвым радзе цэны яшчэ вышэйшыя — супавыя куры па 15, а куры для смажання — ажно 17 рублёў.

— Супавых курэй трэба варыць, прычым доўга. Атрымліваецца вельмі пахкі булён. Гэта мяса-яечная парода, — распавядае прадавец Марыя, якая рэалізоўвае на рынку прадукцыю фермераў з-пад Баранавіч. — А вось запякаць і смажыць лепш бройлера. Цяпер разборлівыя пакупнікі часам не хочуць бройлераў. А ў савецкі час, памятаю, чэргі за бройлерамі стаялі, таму што ў іх мяса мяккае...

Таксама пакупнікам прапануюцца зусім маленькія тушкі куранят, крыху большыя за перапёлак. Прадаўцы называюць іх па прынцыпе агуркоў, «карнішонамі». Цэны на іх — 25-30 рублёў за кг. Адно такое кураня абыдзецца рублёў у 12—13.

— Бяруць іх?

— Бяруць. Дзецям на суп, на святочны стол — па-рознаму. Лепш за ўсё іх разрэзаць, адбіць малаточкам для мяса — і на патэльню. Абсмажыць з двух бакоў — і яны гатовыя.

## ПАРАДЫ ПРАДАЎЦОЎ

Выбіраць курыцу прадаўцы раяць па вонкавым выглядзе — то-бок крытэрый у нашы дні вельмі адносны. Існуе мноства спосабаў надаць курыцы больш таварны выгляд. Ад колеру асвятлення ў вітрынах (таму ацэньваць птушку лепш не «за шклом», а калі яе дасталі і прад'явілі вам "без прыўкрас") да афарбоўкі скуры фарбавальнікамі.

— Колер тушкі залежыць ад шматлікіх фактараў, — кажа прадавец фермерскай курыцы Кацярына. — Парода курыцы, умовы яе вырошчвання, тое, чым яе кармілі. Напрыклад, калі хочуць, каб скура курыцы набыла прыемны жаўтаваты колер, за два тыдні да забою яе кормяць кукурузай. А некаторыя нядобрасумленныя прадаўцы проста вымочваюць курыцу ў растворы куркумы і атрымліваюць патрэбны колер скуры.

Але праверыць гэта нескладана. Прыкладзіце да курыцы чыстую сурвэтку. Калі папера афарбуецца ў жоўты колер, курыцу падфарбавалі.

Пакупнікі лічаць, што жаўтаватая скура адрознівае сапраўдную хатнюю курыцу ад курыцы з птушкафабрыкі. На самай справе, пераконвае суразмоўніца, ні пра якую карысць для здароўя жаўтаватая курыная скура не кажа. Ружовае адценне і лёгкая сінь усяго толькі кажуць аб меншай колькасці падскурнага тлушчу. Калі гаварыць пра колеры, «хатняя» курыца адрозніваецца ад курыцы з птушкафабрыкі ў асноўным колерам кумпячкоў. Афарбоўка мяса кумпячкоў у курыцы заўсёды цямнейшая за далікатна-ружовы колер курынай грудкі, а ў дамашняй птушкі кумпячкі па колеры цямнейшыя, чым у курыцы, вырашчанай на птушкафабрыцы.

**З курыных субпрадуктаў медыкі рэкамендуюць з асцярожнасцю ставіцца да печані бройлерных курэй: яна актыўна «збірае» таксіны.**

Тушка павінна быць гладкая і не мець заган. Перад купляй курыцу рэкамендуецца панюхаць — так робяць дасведчаныя гаспадыні і так раяць прадаўцы. Любы дастаткова моцны пах — сігнал для адмовы ад набыцця. Ну, а прыйшоўшы дадому, можаце нагрэць нож і праткнуць тушку: якасная курыца будзе пахнуць смачна, старая — не вельмі.

Чым меншая тушка, тым менш яна тлустая. Прадаўцы раяць выбіраць невялікую курачку, яна больш карысная для здароўя. Акрамя таго, памятаем, што сапраўдныя фермерскія куры памерам меншыя за тушкі з птушкафабрыкі.

Ну і, вядома, медыкі раяць марынаваць курыцу самастойна і адмовіцца ад куплі курыцы-грыль — ёсць рызыка, што марынадамі і прыправамі нядобрасумленны прадавец маскіруе прыкметы недабраякаснага прадукту.

Важна памятаць, што тэрмічная апрацоўка курынага мяса павінна быць дбайнай. А найбольш бяспечна купляць курыцу не «ў бабуль» на прыдарожных рынках (як робяць часам гараджане ў пагоні «за натуральным»), а ва ўстаноўленых месцах гандлю, дзе існуе санітарны кантроль.

Для лепшага засваення дыетолагі раяць спалучаць курынае мяса з некрухмалістай гароднінай, а не з вугляводамі. І, нягледзячы на ўсенародную любоў да падрумяненай скарыначкі, перад варкай або смажаннем курыцы скуру з яе ўсё ж варта здымаць.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

Ігуменскі тракт
№ 14 (279)

18 мая — Міжнародны дзень музеяў

# ТАЯМНІЦЫ «ДОМА ПАД ТАПОЛЯЙ»

**КУДЫ ІДЗЁМ:**
***Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы***

**ШТО ГЛЯДЗІМ:**

*Супрацоўнікі ўсяляк стараюцца вярнуць сваіх наведвальнікаў пасля ковіду і ідуць на даволі смелыя эксперыменты. Напрыклад, сёлета невялікім групам наведвальнікаў удалося трапіць туды, куды допускаюць не кожнага музейнага работніка — у фондасховішча. Музей прыадчыніў патаемныя шафы ды скрыні і паназёміў з найбольш каштоўнымі прадметамі.*

Толькі рукапісаў самога паэта ў калекцыі музея Янкі Купалы — 561 адзінка захоўвання. Прадметам № 1 стаў верш «Мая доля». Гэта першы напісаны па-беларуску верш паэта (у ліпені 1904 года, калі яшчэ не было ў песняра псеўданіма, твор падпісаны «І. Луцэвіч»). Нядаўна адкрыўся «сакрэт» гэтага музейнага прадмета. Супрацоўнікі Інстытута літаратуразнаўства НАН Беларусі рыхтавалі да выдання збор твораў Янкі Купалы. Іх зацікавіла, чаму верш размяшчаецца на заклееных лістках. Калі рэстаўратары знялі прыклееную паперу, убачылі яшчэ адзін верш — «Аб кабеце».

У фондзе захоўваецца і рукапісны фаліянт — зборнік «Шляхам жыцця». Макет Янка Купала распрацоўваў сам, на ім яго рукой зроблены паметкі. Ён пазначыў, як павінна выглядаць вокладка, і нават прапісаў цану будучага выдання. Зборнік паэт прысвяціў доктару Ярэмічу, які ахвяраваў грошы на выданне кнігі маладога паэта. Свой рукапіс Янка Купала падарыў сябру Клаўдзію Дуж-Душэўскаму. А той у 1930 годзе перадаў фаліянт у беларускі музей Івана Луцкевіча ў Вільні і нават пакінуў у ім запісы па гісторыі рукапісу. Пасля вайны жонцы паэта Уладзіславе Францаўне ўдалося прывезці кнігу назад у Мінск. Сёння рукапісны зборнік «Шляхам жыцця» з'яўляецца нацыянальнай каштоўнасцю першай катэгорыі.

Таксама ў музеі захоўваюцца друкаваныя выданні гэтага зборніка. Прычым яшчэ засталіся пытанні, звязаныя з імі. Так, першае выданне было ў 1913 годзе, другое — у 1923-м. Калі супрацоўнікі музея апісвалі кнігі, звярнулі ўвагу, што ў адзін і той жа год, у адной і той жа друкарні ствараліся зборнікі з рознымі вокладкамі — яны не супадалі колерам і якасцю. Кнігі ад пачатку так выдаваліся, ці, магчыма, змянілі выгляд, калі пра іх захаванне паклапаціліся ўладальнікі?

**Макет Янка Купала распрацоўваў сам, на ім яго рукой зроблены паметкі. Ён пазначыў, як павінна выглядаць вокладка, і нават прапісаў цану будучага выдання.**

Тая ж гісторыя з экзэмплярамі зборніка «Жалейка», якія выйшлі ў адзін год, у адной друкарні, але адрозніваліся вокладкамі. Калі даследчыкі вывучалі дакументы ў архівах, знайшлі аб'яву газеты «Наша ніва» пра выданне зборніка і рахунак беларускай выдавецкай суполкі «Загляне сонца ў наша ваконца», датаваны 4 кастрычніка 1908 года, у якім паведамлялася, што на адрас рэдакцыі было паслана 100 экзэмпляраў зборніка «Жалейка» па 50 капеек і пяць экзэмпляраў — па 80 капеек. Больш дарагі варыянт кнігі друкаваўся на лепшай паперы.

**ЧЫМ УРАЖВАЕМСЯ:**

У фондзе захоўваюцца арыгінальныя фатаграфіі паэта, па якіх можна прасачыць, як Янка Купала апранаўся ў розныя часы. На здымках выява сапраўднага франта! Колькі намаганняў яму трэба было прыкласці, толькі каб мець англійскія вусікі! Іх нельга было стрыгчы, а толькі вышчыпваць пінцэтам. Каб яны трымалі форму, усю ноч даводзілася спаць у спецыяльных навусніках, замацоўваць іх фіксатарамі. Каб паесці і не папсаваць «прыгажосць», на кубачак мацавалі накладку. Да пачатку 1920-х былі модныя кашулі з накрухмаленымі каўнерыкамі, такімі, як у мужа англійскай каралевы. Гэтая мода дакацілася і да Расійскай імперыі. І такія рэчы былі і ў Купалы. Варта звярнуць увагу і на гальштукі паэта, якія рабіліся з дарагіх якасных тканін. Адзін з яго гальштукаў быў зроблены ў нацыянальным стылі — адметная рыса моды 1920-х. У музеі захоўваюцца некаторыя прадметы адзення паэта, відаць, найбольш дарагія яму — тое, што ён узяў з сабой, калі пакідаў Мінск у першыя дні Вялікай Айчыннай вайны. Сярод іх і паліто, падбітае футрам з тхара, з вельмі добрага англійскага сукна, пашытае яшчэ ў дарэвалюцыйны час. На ім захавалася і этыкетка атэлье, што размяшчалася на адной з цэнтральных вуліц Мінска.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

# Вера, мацнейшая за ўсё зямное

**КУДЫ ІДЗЁМ:** ***Нацыянальны мастацкі музей***

**ШТО ГЛЯДЗІМ:**

*У Нацыянальным мастацкім музеі да 13 чэрвеня сваіх наведвальнікаў чакае выставачны праект «Чаму Ты Мяне пакінуў?». Праз экспанаты сакральнага мастацтва раскрываецца тэма трагічнай і таямнічай біблейскай падзеі — распяцця Ісуса Хрыста.*



Назва выстаўкі цытуе перадсмяротны крык распятага Хрыста: «Божа мой! Божа мой! Чаму Ты Мяне пакінуў?» Гэты эпізод лічыцца адным з найбольш драматычных у евангельскім апавяданні. Пакуты і страх зямнога чалавека зразумелыя, а вось што адчувае Бог, які з'яўляецца стваральнікам жыцця?.. Чатыры залы займае экспазіцыя, дзе можна прыслухацца да ўласных разважанняў пра боскае і зямное ў чалавеку. Адкрывае выстаўку скульптура «Хрыстос у турме», якая ў першай зале адзіная размяшчаецца ў паўзмроку. Ты застаешся адзін на адзін з Богам, што дае магчымасць убачыць перад сабой Яго ў зямным вобразе, безабароннага, задуменнага...

— Любы праект змяняецца ў працэсе падрыхтоўкі, і ў ім да апошняга прысутнічае пошук. Першапачаткова была ідэя паказаць крыж і яго інтэрпрэтацыі ў творчасці беларускіх мастакоў. А потым гэтая ідэя знікла, паколькі тыя творы старажытнага беларускага мастацтва, з якімі я пачаў працаваць, падказалі ідэю, што не варта ствараць мікс, бо кожная рэч самадастатковая. Некаторыя з гэтых твораў не адрэстаўраваныя, але стан дазваляе іх экспанаваць. І мне захацелася паказаць іх так, каб можна было засяродзіцца на кожным, — распавядае **куратар праекта, старшы навуковы супрацоўнік аддзела сучаснага мастацтва ХХ-ХХІ ст. НММ Дзмітрый САЛОДКІ.** — Напрыклад, скульптура «Хрыстос у турме». Адразу стала зразумела, што гэты твор адзін з галоўных. Вобраз там настолькі выразны, што мне не хацелася, каб штосьці адцягвала ад яго ўвагу. І ўвогуле ў працэсе стварэння выстаўкі я ўсё больш прыходзіў да разумення, што патрэбна зрабіць яе абсалютна мінімалістычнай... Ты нібы трапляеш у вязніцу да Хрыста. Гэты стан добра перадае і тэму пакінутасці, калі скульптура дэманструе нам вобраз Хрыста не як перамножнага Бога на аблоках, а Бога ў зразумелым чалавечым стане, але для прачытання гэтага трэба застацца з ім сам-насам...

**ЧЫМ УРАЖВАЕМСЯ:**

Пачуццё пакінутасці і адзіноты дыновы погляд на сакральнае мастацтва ў кантэксце вечнасці і сучаснасці — тыя напрамкі, якія сталі асновай для экспазіцыі. Праект у поўнай меры з'яўляецца эксперыментальным, ён абуджае незвычайныя эмоцыі ў гледача, якія нібы становіцца яго ўдзельнікам. Раней сакральнае мастацтва ў Нацыянальным мастацкім музеі паказвалі з мэтай прадэманстраваць пэўную школу, тэхнікі ў творчасці беларускіх майстроў. Гэтым разам у рамках праекта аб'ядналы ўзоры сакральнага мастацтва XVII—XIX стст., якія ствараліся ў стылістыцы перажываннях крыжовых пакут. Палітра работ дазваляе таксама прасачыць і ўвасабленне вобраза ўкрыжаванага Хрыста ў залежнасці ад рэгіёна Беларусі. Прадстаўлены творы з Гродзенскай, Брэсцкай, Мінскай, Віцебскай абласцей. Сярод нешматлікіх экспанатаў можна ўбачыць старажытнабеларускую скульптуру — прастольныя, прыдарожныя распяцці, надкупальны крыж і куратарскую інсталяцыю, якая сімвалізуе Галгофу.

**Кожны са згаданых прадметаў намолены людзьмі, таму праз нейкі час узнікае ўражанне, быццам бы ты не ў музеі, а ў нейкай капліцы.**

Кожны са згаданых прадметаў намолены людзьмі, таму праз нейкі час узнікае ўражанне, быццам бы ты не ў музеі, а ў нейкай капліцы. Тут можна паразважаць пра вечнае, прыслухацца да сваёй душы і падумаць пра Таго, Хто аддаў уласнае жыццё за ўсіх нас, бо любоў і вера мацнейшыя за ўсё зямное.

**Алена ДРАПКО.**

# АД РАСКОПАК ДА АРБІТЫ

**КУДЫ ІДЗЁМ:** ***Нацыянальны гістарычны музей***

**ШТО ГЛЯДЗІМ:**

*Зразумела, у вандроўцы з нагоды музейнага свята нельга абмінуць Нацыянальны гістарычны музей, дзе заўсёды ёсць чым уразіцца.*

Па-першае, гэта праект «Археалогія смерці: Памяць. Вечнасць. Продкі» — цыкл зменных экспазіцый. Праект распавядае аб тым, як змяняліся ўяўленні людзей пра замагільны свет, якія існавалі рытуалы ўшанавання памерлага і што рабілі з яго целам. У межах «Археалогіі смерці» 18 мая адбудзецца лекцыя-падарунак для наведвальнікаў «Утульны замагільны свет: пахавальны абрад паморскай культуры (VII—III стст. да н. э.)». На лекцыі можна даведацца, як хавалі памерлых больш за 2000 гадоў таму і чаму гліняны гаршчок — няпростая рэч. Лекцыю прачытае археолаг, кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін Вадзім Белявец.

Вы думаеце, ваша сузіранне падчас вандроўкі па музеі будзе прывязанае да зямлі? Памыляецеся: вас запросяць у космас! Вельмі прыгожы выставачны праект «108 хвілін. Дарога ў космас» прысвечаны 60-годдзю першага палёта чалавека ў «зорны акіян». На выстаўцы прадстаўлены ўнікальныя артэфакты, многія з якіх ніколі раней не экспанаваліся ў Беларусі. Вы ўбачыце і скафандр касманаўта Юрыя Гагарына, і бартавы часопіс першай жанчыны-касманаўта Валянціны Церашковай. Мастацкая частка выстаўкі складаецца з графічных лістоў касманаўта Аляксея Лявонава, са скульптур аўтарства народнага мастака Беларусі Івана Міско, а таксама з палотнаў заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь Мікалая Апіёка. Трапіць на выстаўку можна будзе да 31 мая.

Яшчэ адзін выставачны праект, які варта ўбачыць, мае назву «Пакінутая зямля» і прысвечаны 35-годдзю аварыі на ЧАЭС. У экспазіцыю ўключаны знаходкі этнаграфічных экспедыцый Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук 1990-х у рэгіёнах, пацярпелых ад аварыі. Артэфакты дэманструюць побыт і культуру вёсак, якія цяпер ужо не існуюць. Вы ўбачыце фатаграфіі флоры і фаўны Палескага дзяржаўнага радыяцыйна-экалагічнага запаведніка, які з'яўляецца месцам пражывання рэдкіх і знікаючых відаў. Таксама на выстаўцы «Пакінутая зямля» экспануюцца работы мастакоў Георгія Паплаўскага, Віктара Шматава і Сяргея Давідовіча-Зосіна. Праект завершыць сваю работу 23 мая.

**ЧЫМ УРАЖВАЕМСЯ:**

Як Нацыянальны гістарычны адсвяткуе «Ноч музеяў»? Вось што распавялі там «Звяздзе».

Мерапрыемствы пройдуць пад агульнай назвай «Музей, ты — космас». Сэнс назвы звязаны з тым, што музей аб'ядноўвае ў сабе розныя віды экспанаванняў артэфактаў.

У межах праекта «Археалогія смерці» адбудзецца лекцыя «Адвечны космас чалавечага жыцця», падчас якой наведвальнікі пазнаёмяцца з традыцыямі пахавання зарубежнай культуры.

**Вы ўбачыце і скафандр касманаўта Юрыя Гагарына, і бартавы часопіс першай жанчыны-касманаўта Валянціны Церашковай.**

Плануецца паказ мод ад «Млына моды», а таксама невялікі экскурс у тэндэнцыі сучаснай беларускай моды.

Арганізатары памятаюць пра эпідэмічную абстаноўку, таму імкнуцца пазбегнуць вялікай колькасці людзей у памяшканні. Некаторыя мерапрыемствы адбудуцца ва ўнутраным дворыку музея. Там пройдзе канцэрт музычных калектываў універсітэта культуры, а таксама кірмаш рамеснікаў.

«Ноч музеяў» у Нацыянальным гістарычным музеі адбудзецца 22 мая.

**Арына КАРПОВІЧ.**

Храмы маёй радзімы

**Царква Свяціцеля Мікалая Цудатворца**
*Новы Пагост, Мёрскі раён*

# БАЦЬКОЎСКАЯ СУБОТА

## ПРАРОЧЫ СОН

*Я бачыў у сне касяк жураўліны.*
*Ён плаўна лунаў над маёю хацінай,*
*Над гаем, над вёскай, дзе я нарадзіўся,*
*Над цэрквай, дзе імем «Міледзій» хрысціўся.*
*Анёлы звышы нам царкву фарбавалі*
*У колер нябёсны, і ў гонар назвалі*
*Міколы Свяціцеля! Веруйце, людзі,*
*Тут Бога ўслаўляйце, Ён нас не забудзе...*

Калі табе ўжо семдзесят гадоў, можна забыцца пра вольны і спакойны сон, які ўласцівы далёкай бестурботнай маладосці. Бо цяпер больш сняцца трывожныя, часам тужлівыя сны, азмрочаныя хваробай і невыразнымі буднямі.

Але напярэдадні бацькоўскай суботы, менавіта дзясятага красавіка, як надзіва, прыснілася мне незвычайны, прывабліва-мройны сон, як у далёкім дзяцінстве. Бачыўся ён чамусьці ў васількова-яскравым колеры, як быццам бы я птушкай лунаю над роднымі мясцінамі малой радзімы, дзе ўжо даўно па волі лёсу не жыву, і з паднябеснай вышыні дзіўлюся на родны кут, на сваю некалі шматлюдную вёску Вусаўцы, што на Мёршчыне, дзе нарадзіўся ў пасляваенны год.

Нейкі час, зачараваны навакольнай прыгажосцю, кружыў у чуллівым сне над прасторай радзімага краю, над высокай Пілікa-гарой з яе стромымі схіламі, над ціхаплыннай рачулкай, што стужкай абвівала вёску, а потым з завоблачнай вышыні спусціўся бліжэй да зямлі — а ўнізе, тут, бязгалосая цішыня! У сне на бязмежнай ніве не трызніўся шум жыта, не чуўся духмяны пах чабару, толькі кідалася ў вочы пасіленая трава абапал вёскі на даўно не кошаных пожнях.

Прачнуўшыся, не мог паверыць — можа, не толькі сон усё, што зараз прысніў?

І калі нясмелая раніца стала прабівацца праз фіранкі, я ўжо быў на нагах. Памаліўшыся, папрасіў ва Ўсёмагутнага Бога благаславення на паездку дамоў, на малую радзіму. Бо быў перакананы — гэта Госпад праз прарочы сон даў мне ведаць, што трэба абавязкова сёння, у бацькоўскую суботу падчас Вялікага посту, ізноў наведаць родныя мясціны і прывесці ў парадак магілкі родзічаў.

Спачатку вырашыў заехаць у Новапагосцкую царкву Свяціцеля Мікалая Цудатворца, дзе прыняў таінства хрышчэння, і якую, на жаль, з розных прычын наведваю не так часта.

## ГІСТОРЫЯ ХРАМА

Новапагосцкая Мікалаеўская царква, да якой я прыехаў акурат да пачатку памінальнай службы, помнік архітэктуры рэтраспектыўна-рускага стылю. Яна пабудавана ў 1878 годзе пад наглядам протаіерэя Венядзікта Любінскага, які тут жа, побач з царквой, і пахаваны.

Будаваўся храм за кошт ахвяраванняў вернікаў, з цэглы і бутавага каменю. Накрыты шатровым дахам з цыбулепадобным купалам на 8-гранным барабане, з праваслаўным крыжам уверсе. Па сведчанні мясцовых жыхароў, з 1878 года храм Свяціцеля Мікалая Цудатворца не закрываўся, і богаслужэнні ў ім здзяйсняліся і ў гады Вялікай Айчыннай вайны, і ў перыяд ганенняў. Царква з'яўляецца галоўным упрыгажэннем мястэчка, дзе жыве каля тысячы чалавек. У храме, якому ўжо 143 гады, можна не толькі памаліцца Богу, але і ёсць на што паглядзець — на ўбранне, старадаўнія абразы.

У царкве людзей было няшмат, некалькі чалавек з мясцовых пазналі мяне, і ў знак павагі мы прывіталіся адзін з адным кіўком галавы. Скляпенне пад купалам храма сімвалізуе злучэнне нябеснага і зямнога. Надзвычайнае ўражанне захавалася ў маёй памяці, калі звод быў яшчэ з густам распісаны, бачылася, як па блакітным небе плывуць невялічкія воблачкі, а сярод іх лунаюць анёлы. Цяпер увесь купал знутры пафарбаваны ў белы аднастайны колер — можа, не знайшлося сродкаў на рэстаўрацыю... І ў цэлым адчуваецца, што ўся старажытная царква, як звонку, так і ўнутры, патрабуе аднаўлення.

Усе з нецярпеннем чакалі пачатку богаслужэння, і я таксама пільна ўглядаўся, калі адкрыюцца царскія вароты і выйдзе святар. Пеўчых не было, адзін немалады ўжо мужчына, з чорнай, як сажа, барадой, хуткамоўна чытаў на кліросе малітву, а мне памятаецца, нават у савецкія часы ў Новапагосцкай царкве быў зладжаны, шматгалосы хор пеўчых. Бывала, як заспяваюць, аж сэрца заходзіцца, і душа ўзносіцца да нябёсаў.

У дзяцінстве я наведваў царкву не так часта, бо савецкая школа не ўхваляла рэлігійныя служэнні, а за аслушэнства маглі і з піянераў або з камсамола выключыць. Але я з мамай употай па вялікіх святах усё роўна хадзіў у царкву, асабліва на Пакроў Прасвятой Багародзіцы, калі ў Новапагосце ладзіўся вялікі фэст. На свяце заўжды было шмат людзей, з'язджаліся святары з усёй акругі, часам прыязджаў і сам Уладыка.

## ЯК МЯНЕ ХРЫСЦІЛІ

Помніцца, аднойчы на шляху з царквы дадому (а крочыць у маю вёску Вусаўцы трэба было амаль дзевяць кіламетраў па бярозавай алеі, якая цяністай сцяной цягнулася ўздоўж усёй дарогі) я захацеў высветліць паходжанне майго незвычайнага імя. І ў тую далёкую жоўтакудрую восень набожная мама распавяла, як праходзіў мой абрад хрышчэння і нарачэння мяне Міледзіем.

Нарадзіўся я ў дні шанавання святых апосталаў Пятра і Паўла, і звычайна імёны святых апосталаў атрымлівалі немаўляты, якія нарадзіліся ў гэтыя дні. Таму мама вырашыла назваць мяне Пятром, так і наказала хросным бацькам, што павезлі дзіця ў Новапагосцкую царкву. Хросная маці, Альдона Робертаўна Чарняўская, была маёй маме сяброўкай і стрыечнай сястрой, а хросны бацька — Васіль Уладзіміравіч Бортнік, спагадлівы сусед. І як казала мама, яна нават і ў думках не магла чакаць нейкай неспадзяванкі, бо Альдона надзейная сяброўка, а Васіль хоць і аматар выпіць, але пакуль з галавой сябраваў.



Настаяцель храма Свяціцеля Мікалая Цудатворца ў Новапагосце, іерэй Уладзімір СТРАХА з сынам Мікалаем каля магілы протаіерэя Венядзікта Любінскага. Фота: 10.04.2021 г.

У дарогу нарачоным бацькам маці ў воз палажыла бутэльку гарэлкі і клунак немудрагелістай закускі, з думкай, няхай на зваротнай дарозе перакусяць. Бо перш чым хрысціць дзіця ў царкве, варта хросным бацькам быць нашча, не еўшы, каб паспавядацца і прычасціцца.

І як потым расказала Альдона, Васіль, толькі ад'ехалі ад хаты, ураз парушыў усе царкоўныя каноны, адкаркаваў посуд з перавачом і, нягледзячы на лаянку Альдоны, стаў «прычашчацца», прагна прыкладаўшыся смаглымі вуснамі да рыльца бутэлькі. Маўляў, пасля ўчарашняй п'янкі ўсё гарыць унутры, не пахмяліўшыся, магу і памерці, а мне яшчэ трэба дзіця трымаць пры хрышчэнні.



І ўжо «падлячыўшыся», крыху хмельны Васіль завёў няпростую гаворку (прыводжу іх дыялог даслоўна, як казала нябожчыца-маці):

— Ведаеш, Альдона, мая жонка Ніна прапанавала назваць дзіця не Пятро, а Мілецій. Ён будзе звацца, як мой швагер, ну ты ведаеш яго, — Васіль з надзеяй паглядзеў на Альдону, якая трымала на руках спячае немаўля.

— Ты што, ашалеў ад гарэлкі, Васіль? — спуджана паглядзела на суразмоўніка Альдона. — А што нам Лідзя скажа?

— А Лідзі, я думаю, усё роўна, каго адной гадаваць, сірату Пятра ці Мілеція.

І, крыху памаўчаўшы, дадаў:

— Шкада, напакутуецца малец, бо нарадзіўся ў бяспрасветнай галечы.

— Не сірата ён пры жывой маці, а час пакажа, можа, яшчэ вунь кім стане, галоўнае, каб быў здаровы, а Лідзя баба дужая і духам, і целам. Адужае, падыме сына — нічога, што адна, яшчэ Бог і дзяржава дапамогуць, калі разумны будзе, вывучыць, — гледзячы на царкоўныя крыжы, якія ўжо бачыліся ўдалечыні, тройчы перахрысцілася Альдона.

—Ты мне, Альдона, не пярэч, назавем дзіця па-мойму, і баста, бо колькі я ведаю, усе, што ёсць у акрузе, Мілеціі — людзі добрыя, — адзначыў Васіль.

Альдона прамаўчала, бо што ж, праваслаўная царква аднолькава праслаўляе як апостала Пятра, так і святога пакутніка Мілеція.

Таінства хросту прайшло спакойна, апоўдні расхваляваная маці дачакалася ахрышчанага сына і чамусьці не вельмі сердавала, што хрысцілі яго пад іншым імем. Але калі госці зайшлі ў хату і адкрылі царкоўныя метрыкі, былі вельмі здзіўленыя, бо там імя было запісана не Мілецій, а чамусьці Міледзій.

За святочна прыбраным сталом з няхітрымі пачастункамі ўсе доўга абураліся промахам бацюшкі, але калі выпілі за здароўе новаахрышчанага Міледзія, вырашылі — няма чаго панікаваць. Можа, гэта сам Бог спаслаў мальцу імя Міледзій, значыць, так таму і быць. Беражы яго, Божа!

## СЁННЯШНІ ДЗЕНЬ ЦАРКВЫ

Цяпер у Новапагосцкай царкве я ўбачыў маладога яшчэ святара. Пасля заканчэння царкоўнай службы бліжэй пазнаёміўся з бацюшкам. Айцец Уладзімір аказаўся добрым, зычлівым чалавекам. Нарадзіўся ён у Століне ў глыбока рэлігійнай сям'і, і, як вынік, два сыны, на радасць бацькам, сталі святарамі. Дружная сям'я іерэя Уладзіміра выхоўвае чатырох дзетак. Матушка Ксенія працуе сястрой міласэрнасці ў Мёрскай бальніцы і ў вольны час дапамагае ў царкве, прыгожа спявае на кліросе.

За кубкам гарачай кавы, што прыгатавала матушка, мы завялі даверлівую гаворку. Доўга размаўлялі пра сучаснае жыццё і царкоўныя справы. Са слоў бацюшкі я даведаўся, што за апошнія гады царкоўны прыход значна паменшыўся. Гадоў дваццаць таму ён налічваў больш за трыццаць вёсак, а сёння з новым падзелам тэрыторый прыхода ў 2020 годзе засталося толькі восем вёсак, уключаючы мястэчка, дзе больш вернікаў-каталікоў. З гэтага з'явіліся фінансавыя цяжкасці. Пачалі рамонт царкоўных купалоў і не могуць скончыць — няма грошай, ужо не кажучы пра ўнутранае адстройванне. Душа баліць за старадаўнюю царкву, наракаў бацюшка. Вось шукаю спонсараў, але пакуль ніхто не адгукнуўся.

**«Ты мне, Альдона, не пярэч, назавем дзіця па-мойму, і баста, бо колькі я ведаю, усе, што ёсць у акрузе, Мілеціі — людзі добрыя...»**

Мне неяк стала няёмка перад бацюшкам, нашы продкі сто сорак гадоў таму змаглі сваімі рукамі і за свой кошт пабудаваць прыгажуню-царкву, а мы сёння, у стагоддзе прагрэсіўных тэхналогій, калі ў кожнага з нас каля хаты паркуецца адзін, а то і больш асабістых аўтамабіляў, не можам ахвяраваць некалькі соцень рублёў на рамонт нашай мясцовай святыні. Не, не па-Божаму гэта, землякі, прыхаджане...

Падзякаваўшы матушцы Ксеніі за гасціннасць і духмяную каву, мы з бацюшкам Уладзімірам і яго сынамі схадзілі яшчэ раз да царквы і зрабілі некалькі памятных здымкаў.

Развітаўшыся з гасціннай сям'ёй святара, я паехаў наведаць Вусаўскія могілкі, адначасова заехаў ва ўрочышча Дубакі, дзе калісьці стаяў наш радавы хутар. На жаль, ад хаты не засталося нават адзінага каменя. Толькі пясчанае поле, засеянае жытам, рассцілалася ажно да Красноўскай гары.

Больш за гадзіну я папраўляў магілы родных, а потым з малітвай звярнуўся да Бога, каб спаслаў вечнае супакаенне душам памерлых родных і ўсіх землякоў.

*Між дрэваў крыжы навяваюць спакой,*
*Вясковыя могілкі — помнік былога.*
*Наведаў сягоння я кут родны свой,*
*Хаджу між магіл, а ў душы штось трывога.*
*Камень надмагільны пад ценем бяроз*
*Вякамі стаіць, увесь мохам пакрыты.*
*Ён сведка людскoе пакуты і слёз,*
*А зараз вось бурыцца, усімі забыты.*
*Здалёку ці зблізку прыехаў, прыйдзі*
*На могілкі блізкіх, за іх памаліся.*
*Успомні свой род і свае карані,*
*І ўсім землякам да зямлі пакланіся.*

**Міледзій КУКУЦЬ,**
**сябар Саюза пісьменнікаў Беларусі.**

**ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Табаквинторг» (продавец) извещает о проведении 2 июня 2021 года повторного открытого аукциона по продаже имущества в 12.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2**

| |
|---|
| **ЛОТ № 1:** изолированное помещение с инвентарным номером 350/D-133417 площадью 422,3 кв. м, назначение – торговое помещение, наименование – магазин |
| **Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, пр-т Ленина, 34-166 |
| **Информация о земельном участке:** кадастровый номер 340100000001000826, площадь 0,4579 га (доля в праве 301/10000); назначение – Земельный участок для эксплуатации и обслуживания жилого дома и изолированных помещений, не относящихся к жилищному фонду |
| **Начальная цена продажи с учетом НДС: 1 262 520,00** бел. рубля |
| **Задаток (10 %) с учетом НДС: 126 252,00** бел. рубля |

**Продавец: ОАО «Табаквинторг»**, г. Гомель, ул. Могилевская, 1а. Контактный телефон +375 29 334-04-60.

**Шаг аукциона – 5 % от предыдущей названной аукционистом цены продажи предмета аукциона.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1**. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца ОАО «Табаквинторг»: р/с BY53BPSB30121470060139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Гомель, ул. Крестьянская, 29а, БИК BPSBBY2X.**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения. **Прием заявлений заканчивается 31.05.2021 г. в 17.00.**

**Для участия в аукционе предоставляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем (далее – ИП) Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юр. лица или ИП; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным ИП – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юр. лица Республики Беларусь – доверенность; представителем гражданина или ИП Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или ИП – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия.

**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения.** В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %.** Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти)** календарных дней с момента подписания протокола; оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати)** календарных дней после подписания договора купли-продажи; возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в размере 1,0 % в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62 и на сайте www.deloocenka.by**

## Изменения в проектной декларации ООО «Датч Стар»,

### опубликованной в газете «Звязда» 11.04.2020 г.

«Многоквартирный жилой дом с подземной гараж-стоянкой (№ 1 по генплану в квартале пр. Дзержинского – ул. Щорса – ул. Железнодорожная – ул. Хмелевского) со встроенно-пристроенными объектами обслуживания населения» (III очередь строительства).

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предлагаются:

**45 однокомнатных квартир** площадью от **30** до **71** кв. м, составляющей долларовый эквивалент от **1200** до **1530** долларов США за 1 кв. м

**20 двухкомнатных квартир** площадью от **80** до **97** кв. м, составляющей долларовый эквивалент от **1100** до **1350** долларов США за 1 кв. м.

**25 машино-мест** площадью от **12** до **27** кв. м, составляющей долларовый эквивалент от **8 300** до **16 000** долларов США.

На предприятии действует система регулирования стоимости, зависимая от площади, этажа и условий оплаты строящегося жилого помещения».

Дополнительную информацию можно получить по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, помещение 860.

Тел.: +375 44 534 30 00, +375 29 534 30 00

УНП191061436.

Пасведчанне аб рэгістрацыі арганізацыйнай структуры грамадскага аб’яднання № 01-120 Брэсцкая абласная арганізацыйная структура грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства аўтааматараў». Зарэгістравана рашэннем упраўлення юстыцыі Брэсцкага аблвыканкама ад 24.08.2007. Юрыдычны адрас: Рэспубліка Беларусь, 224025, г. Брэст, вул. Беларуская, 68, УНП 200195022, **лічыць несапраўдным у сувязі са стратай.**

УНП100039650

**ЗАСО «Промтрансинвест» предлагает принять участие в процедуре закупки работ по разработке мобильного приложения и его технического обслуживания № 2021-899466**, размещенной на сайте http://www.icetrade.by, по «Информационные технологии> Другое».

УНП100357923

Утерянные бланки полисов формы 2РН серия КЕн № 0053306, 0053307, 0053308 ЗАСО «КЕНТАВР» **считать недействительными.**

УНП100985903

Центр Промышленной Оценки

**• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ**
**• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by** |
| **Продавец** | **ОАО «Институт БЕЛОРГСТАНКИНПРОМ», ул. Долгобродская, 16, комн. 405, 220038, г. Минск** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. www.ipmtorgi.by** |
| **Предмет электронных торгов: ИЗОЛИРОВАННОЕ ПОМЕЩЕНИЕ по адресу: г. Минск, ул. Долгобродская, 16-3** | |
| **Административное помещение** (административное помещение) общей площадью 1150,2 кв. м, инвентарный номер 500/D-708041775. **Обременение:** аренда. Подробная информация на сайте www.cpo.by | |
| **Начальная цена с НДС 20 %** | **2 251 310,40 белорусского рубля** |
